

Пераможцы «Ураджайнага лета са «Звяздою»

СТАР. 4



Памяці падводнікаў-беларусаў

СТАР. 5



Таямніцы Лошыцкага парку

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЛІПЕНЯ 2014 г. АЎТОРАК № 130 (27740) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПРЫНЦЫПОВЫ ПАДЫХОД

### НЕЭФЕКТЫЎНЫЯ СЕЛЬГАСПРАДПРЫЕМСТВЫ БУДУЦЬ ПРЫВАТЫЗАВАНЫ

**Гэта адбудзецца ў выпадку, калі за паўгода яны не выйдуць на бясстратную працу. Пра гэта Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў учора, прымаючы з дакладам прэм'ер-міністра, кіраўніка рабочай групы па ўдасканаленні дзяржаўнай аграрнай палітыкі Міхаіла Мясніковіча, паведамляе БЕЛТА.**

«Сёння ўжо цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю як оптам, так і ў розніцу такія, што нашай сельскай гаспадарцы, якая атрымала немалую падтрымку ад дзяржавы ў папярэднія дзве пяцігодкі, можна жыць самастойна і зарабляць, што і робяць сельгаспрадпрыемствы — калгасы, саўгасы, якія хочуць жыць і працаваць», — адзначыў Прэзідэнт.

«Мы дамовіліся, што павінны падтрымаць тых, хто сёння можа выйсці на бясстратную працу і працаваць самастойна, а тым, якія не хочуць і не могуць, мы павінны даць тэрмін як мінімум да канца года і прыватызаваць, прадаць тым, хто хоча працаваць. Таму няхай думаюць і вырашаюць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён звярнуў увагу на тое, што кіраўнікі гэтых прадпрыемстваў там ужо працаваць не будуць, магчыма, нават спецыялістамі.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што да разгляду гэтага пытання ўжо падыходзілі неаднойчы, у тым ліку і на ўзроўні кіраўніка дзяржавы. Спецыяльна створанай камісіяй па разглядзе праблемных пытанняў у аграрнай сферы пад кіраўніцтвам прэм'ер-міністра былі вынесены на разгляд Прэзідэнта нарматыўна-прававыя акты, якія закліканы ліквідаваць «вузкія» месцы ў сельскай гаспадарцы. «Мы дамовіліся аб тым, што вы ўсё гэта палічыце і з улікам няпростага фінансава-эканамічнага становішча не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце мы зробім выснову, ці зможам мы пайсці на тыя меры, якія прапанаваны камісіяй», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, гэта няпростыя і вельмі затратныя для сельскай гаспадаркі меры. «Таму я хацеў бы, каб мы да гэтага пытання падышлі не ведамасна, а вельмі прынцыпова і адкрыта, і дзяржава прыняла на сябе тыя абавязацельствы, якія можа адужаць», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што галоўнае пытанне заключаецца не ў тым, колькі гэта будзе каштаваць, а ці вытрымае дзяржава такую нагрузку з пункту гледжання фінансаў.

## СПАТКАННЕ З МАЛАДОСЦЮ



Фота БЕЛТА.

**У аграгарадку Вішоў Бялыніцкага раёна ўрачыста адкрыўся музей калгаса «Радзіма».**

Старшыня праўлення калгаса «Радзіма» Аляксандр Лапацентаў добра ведае вялікую сілу мастацтва. Менавіта ён некалькі гадоў таму ініцыіраваў правядзенне на базе гаспадаркі Міжнароднага пленэру «Вішоўскія краявіды». На палотнах — працаўнікі і ветэраны калгаса, мясцовыя славутасці. Пад мастацкія творы ў музеі адведзена адна з 5 залаў. У астатніх размясціліся экспанаты, прысвечаныя этнаграфіі раёна, ваеннай і працоўнай дзейнасці мясцовых жыхароў, а таксама фотаальбомы і відэасюжэты аб знакавых падзеях Вішова і працоўнага калектыву гаспадаркі. Ёсць нават інфармацыйны кіёск, дзе можна атрымаць гістарычную даведку аб аграгарадку і яго наваколлі.

У адкрыцці музея прыняў удзел старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Надзея ЕРМАКОВА, старшыня праўлення Нацыянальнага банка:**

***«Нам неабходна адыходзіць ад ільготнага крэдытавання ў жыллёвым будаўніцтве. Дзяржава прадастаўляла і будзе прадастаўляць ільготныя ўмовы крэдытавання сем'ям з трыма і больш дзецьмі. Усе астатнія, хто не падпадае пад дзеянне адпаведнага ўказа Прэзідэнта, знаходзяцца ў роўных умовах. Маладыя сем'і ці са стажам — гэта ўсё роўна сем'і. Ёсць такія, якія выгадавалі ўжо ўнукаў у інтэрнатах і таксама маюць патрэбу ў падтрымцы. Але ад ільготных крэдытаў трэба адыходзіць. Мы цяпер распрацоўваем сістэмы будзберажэнняў. Многія просяць іпатэку. Думаю, сёлета яна запрацуе ў поўным аб'ёме. Залог нерухомасці пры будаўніцтве жылля выкарыстоўваецца ва ўсім свеце».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.07.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10250,00 | ▲ |
| Еўра | 13970,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 299,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 876,07 | ▼ |

■ Абітурыент-2014

## У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — ІТ-СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ, ЭКАНОМІКА І ПРАВАЗНАЎСТВА

### А ў ВНУ сельскагаспадарчага і педагагічнага кірунку засталіся незапоўненыя бюджэтныя месцы

**Студэнтамі мараць быць усе, а тым больш навучацца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. У суботу, пасля таго як дзверы прыёмных камісій ВНУ зачыніліся, многія з абітурыентаў уздыхнулі з палёгкай: усё, што ад іх залежала, яны зрабілі. Але вось ці ўгадалі з выбарам?**

У Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце ў апошнія гадзіны работы прыёмнай камісіі дзясяткі абітурыентаў забіралі свае дакументы і перападавалі іх на тыя спецыяльнасці, дзе, па іх падліках, у іх яшчэ заставіліся шанцы трапіць на «бюджэт». Таму сітуацыя на некаторых факультэтах з прахаднымі баламі пасля 18 гадзін істотна змянілася. Натуральна, што хтосьці прагадаў са сваімі падлікамі, а хтосьці, наадварот, аказаўся ў выйгрышы. Многія ВНУ абнавілі звесткі па колькасці прынятых заяў яшчэ позна ўвечары 12 ліпеня. Іншыя зрабілі гэта ў нядзелю. Але на сайтах некаторых ВНУ яшчэ і ў панядзелак былі прадстаўлены звесткі толькі пра колькасць пададзеных заяў па стане на 15 гадзін 12 ліпеня, што выглядае, як мінімум, дзіўна.

### Фізіка і матэматыка — шлагбаум для слабых абітурыентаў

Як і чакалася, сур'ёзны адсеў абітурыентаў пасля няўдалай здачы ЦТ па фізіцы і матэматыцы, адбіўся галоўным чынам, на запаўненні інжынерна-тэхнічных спецыяльнасцяў і спецыяльнасцяў у сельскагаспадарчых ВНУ.

СТАР. 2

## МЕКСІКАНЕЦ ПАКАРЫЎ ВІЦЕБСК



Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

**Прадстаўнікі Мексікі раней не выступалі на конкурсе маладых выканаўцаў. Тым не менш спявак, які прыехаў на «Славянскі базар» з гэтай краіны, набраў балаў больш, чым яго канкурэнты.**

Учора падчас цырымоніі ўзнагароджвання абаяльны Радрыга дэ ла Кадэна *(на фота)* атрымаў Гран-пры (20 тысяч долараў). І прэмію (15 тысяч долараў) журы прысудзіла спеваку з Малдовы Віталіе Негруца. ІІ прэмію (10 тысяч долараў) — падзялілі ўкраінка Вераніка Дораш і выканаўца з Харватыі, які выступае пад творчым псеўданімам Дзіна; ІІІ прэмію (5 тысяч долараў) — Дыяна Голбі з Ізраіля і Мархаба Сабіева з Казахстана. Прадстаўнік Беларусі, 23-гадовы Артур Міхайлаў, стаў уладальнікам спецыяльнага прыза Парламенцкага Сходу Беларусі і Расіі. Такую ж узнагароду атрымаў і расійскі выканаўца Злат, у якога, дарэчы, учора нарадзілася дачка.

Безумоўна, талент з далёкай Мексікі годны «галоўнага слана». Дзве песні, выкананыя ў фінале, — руская «Калинка» і мексіканскі хіт «Besame Mucho», пакарылі як журы, так і гледачоў.

Пасля выканання «Besame Mucho» Радрыга на сцэне амфітэатра, адказваючы на пытанні вядучых конкурснай праграмы, сказаў, што ён, хоць знешне і падобны да Санча Панса, але з душой Дон Кіхота.

У свае 26 гадоў талент з Мексікі дасягнуў многага. Ён — спявак, кампазітар, аранжыроўшчык, музычны прадзюсар, тэле-і радыёвядучы. Восем гадоў быў арт-дырэктарам тэатра «Esperanza Iris». Да таго ж ён яшчэ і мастацкі кіраўнік і ўладальнік забаўляльнага клуба «La Cueva». Піша музыку і вершы. Дзякуючы супрацоўніцтву з радыёканаламі Мексікі спрыяе захаванню і распаўсюджванню музычнага жанру балеро, а таксама рамантычнай музыкі залатога стагоддзя.

СТАР. 3

■ Надвор'е

## СТЫХІЯ — СПРАВА ЗВЫЧАЙНАЯ?

### Сіноптыкі абяцаюць спякоту за 30, а таксама моцныя ліўні і град

**І на гэтым тыдні на тэрыторыі Беларусі захаваецца трапічнае няўстойлівае надвор'е, калі гарачыня будзе суправаджацца сур'ёзнымі ападкамі, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Людміла ПАРАШЧУК.**

Максімальная тэмпература паветра сёння складзе плюс 25–30 градусаў. На працягу дня на захадзе і ўсходзе краіны пройдуць навальнічныя дажджы. Пры навальніцах шквалістае ўзмацненне ветру да 15–20 метраў у секунду. Месцамі магчымы град і моцныя ліўні. Захаваецца ўплыў актыўных атлантычных франтоў і ў сераду. Уначы месцамі, а ўдзень паўсюдна пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ў ноч на сераду будзе плюс 12–17 градусаў, удзень прыгрэе да 24–29 цяпла, а па паўднёвым усходзе Гомельскай і Магілёўскай абласцей гарачыня будзе дасягаць нават плюс 30–31 градуса.

Айчынныя спецыялісты падлічылі, што ў другой палове тыдня чакаецца павелічэнне атмасфернага ціску і дажджоў стане менш. Аднак тэмпературны фон застанецца анамальна высокім. Уначы будзе плюс 12–18 градусаў, удзень — 24–29 цяпла. Уначы і раніцай у нізінах і побач з вадаёмамі магчымы кароткачасовы туман.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў нашых сіноптыкаў, у большасці рэгіёнаў краіны захаваецца спякотнае надвор'е і ў выхадныя. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе ў межах плюс 24–28 градусаў.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КНДР ЗАПУСЦІЛА СТО РАКЕТ У БОК ЯПОНСКАГА МОРА

Паўночная Карэя выпусціла каля ста ракет у бок Японскага мора. Масіраваны абстрэл правodзіўся з усходняга ўзбярэжжа КНДР, непадалёк ад дэмілітарызаванай зоны, якая падзяляе Паўночную і Паўднёвую Карэю, паведамляе Associated Press. Усе ракеты ўпалі на тэрыторыі КНДР, аднак паблізу ад падзяляльнай лініі. Масіраваны ракетны ўдар стаў адказам на сумесныя ваенныя вучэнні Паўднёвай Карэі і ЗША, якія будуць праходзіць з 16 па 21 ліпеня. У іх, у прыватнасці, будзе ўдзельнічаць амерыканскі авіяносец «Джордж Вашынгтон».

### У ЛАТВІІ ЗДАЮЦЬ АЛКАГОЛЬ НАПРАКАТ

Прадпрымальнікі з Баўска (горад на поўдні Латвіі) прыдумалі спосаб абысці забарону на гандаль спіртным у начны час, прапанаваўшы ахвотным узяць алкаголь напракат. Пра гэта паведамляе DELFI. Лісткі з рэкламай новай паслугі раздавалі наведвальнікам мясцовага фестывалю музыкі кантры. Акрамя таго, адпаведная аб'ява было апублікавана ў мясцовай газеце Bauskas Dzive. Патэлефанаваўшы па ўказаным нумары, журналіст выдання высветліў, што ўзяць алкаголь напракат можна з 22:00 да 08:00 — гэта значыць, у перыяд, калі ў крамах забаронены продаж спіртнога. Дастаўка літровай бутэлькі рому Casino ў пасёлак непадалёк абышлася карэспандэнту ў 25 еўра. Згодна з умовамі здзелкі, калі па нейкіх прычынах тавар не быў выкарыстаны да раніцы, яго можна вярнуць прадаўцу і атрымаць назад грошы. Служба дзяржаўных даходаў паабяцала пазней пракаментаваць законнасць гэтага бізнесу.



### ПРОЙГРЫШ ЗБОРНАЙ АРГЕНЦІНЫ ВЫЛІЎСЯ Ў МАСАВЫЯ БЕСПАРАДКІ

З-за беспарадкаў, якія ўспыхнулі ў цэнтры Буэнас-Айрэса пасля паражэння зборнай Аргенціны ў фінале ЧС-2014 па футболе, пацярпелі 15 паліцэйскіх, паведамляюць інфармагенцтвы. Пасля заканчэння матча Аргенціна-Германія дзясяткі тысяч балельшчыкаў выйшлі на вуліцы Буэнас-Айрэса, каб адзначыць у цэлым паспяховае выступленне сваёй зборнай на чэмпіянаце. Людзі залазілі на аўтамабілі, размахвалі сцягамі, запускалі феерверкі. Аднак неўзабаве ад асноўнага натоўпу аддзялілася невялікая група агрэсіўна настроеных фанатаў, якая пачала граміць вітрыны крам і шкло аўтамабіляў. Адбыліся сутыкненні з паліцыяй. Супрацоўнікам правапарадку прыйшлося прымяніць слёзатачывы газ і вадзяныя гарматы для разгону натоўпу. Па меншай меры 40 чалавек затрыманы.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### АРГАНІЧНЫЯ ПРАДУКТЫ ЎСЁ Ж БОЛЬШ КАРЫСНЫЯ

Універсітэт Ньюкасла паставіў кропку ў спрэчках адносна карысці арганічных прадуктаў харчавання (выраблены без выкарыстання сінтэтычных угнаенняў, рэгулятараў росту, ГМА і г. д.). Высновы брытанскіх навукоўцаў адназначныя: арганічныя прадукты змяшчаюць на 19–69% больш антыаксідантаў і іншых карысных злучэнняў, чым прадукты, выраблены звычайным чынам. Да таго ж у арганічных прадуктах можна знайсці ў чатыры разы менш таксічных металаў і пестыцыдаў. Праўда, у арганічных прадуктаў ёсць і мінусы. У прыватнасці, у іх зніжана колькасць бялку. Раней Універсітэт Стэнфарда даказаў, што арганічныя прадукты харчавання на самой справе не такія ўжо карысныя, як прынята лічыць. Арганічныя і звычайныя прадукты ў цэлым асабліва не адрозніваліся па пажыўнасці, хоць у арганіцы на 30% радзей змяшчаліся пестыцыды.



КОРАТКА

На планеце за перыяд з 1970 па 2012 год адбылося 8 тыс. 835 стыхійных бедстваў, якія прывялі да гібелі 1,94 млн чалавек, паводле звестак Цэнтра навін ААН. У гэты перыяд засухі, экстрэмальная тэмпература, паводкі, трапічныя цыклоны і іншыя прыродныя бедствы нанеслі ўрон у памеры $2,4 трлн.

Стаўка рэфінансавання ў Беларусі з 16 ліпеня зніжаецца да 20,5% гадавых.

Авіякампанія «Белавія» ўпершыню прадстаўлена на адным з буйных авіякасмічных салонаў у свеце — Farnborough International Airshow (Вялікабрытанія).

Падчас міжнароднай выставы ўзбраення і ваеннай тэхнікі MILEX-2014 падпісана амаль 15 кантрактаў на агульную суму прыкладна $700 млн.

Чатыры паліклінікі адкрыюцца ў сталічных мікраараёнах Дружба і Каменная Горка ў 2014-2016 гадах.

Два беларускія турысты загінулі на Камчатцы. Ратавальнікі пошукава-выратавальнага атрада Камчацкага края знайшлі іх целы на вулкане Камень, які размешчаны ва Усць-Камчацкім раёне.

## ТРЫУМФ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Зборная Германіі чацвёрты раз у гісторыі стала чэмпіёнам свету па футболе

Усё ж такі футболам кіруе не толькі фартуна, але і вялікая логіка разам са справядлівасцю. Сум і расчараванне аргенцінскіх балельшчыкаў, якія да апошняга верылі ў вікторыю сваіх хлопцаў, патанулі ў моры нямецкага шчасця. Усё па справе. «Бундэсманшафт» правяла бразільскі чэмпіянат на адным подыху і яшчэ на групавым этапе лічылася адным з фаварытаў першынства. Іх імкненне да перамогі было заўважна ў кожным паядынку, а паўфінал з Бразіліяй стаў наогул фестывалем галявой разнастайнасці. 7:1 — яшчэ ніколі бразільцы не саступалі з такой розніцай. Тым больш на сваім стадыёне.

СТАР. 8

Германія святкуе чэмпіёнства.



■ На кантролі

# РЫБКІ Ў КАНСЕРВЫ НЕ ДАКЛАЛІ

## Гандлёвыя арганізацыі Віцебска атрымалі прадпісанні аб канфіскацыі з абарачэння некаторых відаў харчовай прадукцыі

**Парушэнні былі выяўлены Віцебскай абласной інспекцыяй Дзяржстандарта ў расійскіх кансервах і піве кампаніі «Хайнекен». Так, выпрабаванні ўзораў стэрылізаваных рыбных кансерваў «Кілька балтыйская неразабраная ў таматным соусе», выробленых акцыянерным таварыствам «Велрыбпрам» (Расійская Федэрацыя, Пскоўская вобл., г. Вялікія Лукі) выявілі, што яны не адпавядалі патрабаванням стандарту па масавай долі рыбы.**

Стандарт вызначае, што ў 100 г гатовага прадукту павінна быць змешчана 70 г рыбы і 30 г падліўкі. Гэта мінімальны ўзровень. У маркіроўцы кансерваў вытворца паказаў масавую долю рыбы — 161 г і масу нета — 230 г, што адпавядае ўстаноўленаму патрабаванню. Фактычна ж у выпрабаваных узорах колькасць рыбы склала ад 153 г да 160 г пры адпаведнай масе нета. Кантралёры лічаць, што такое парушэнне ўводзіць спажыўца ў зман шляхам прадастаўлення недакладнай інфармацыі аб колькасці асноўнага кампанента ў прадукце і вымушае спажыўца аплачваць «эканомію» вытворцы.

Названыя рыбныя кансервы паступілі на рэалізацыю ад сталічнага ААТ «Союзхарчпрам» з дэкларацыяй аб адпаведнасці, прынятай імпарцёрам ААТ «Гроднарыба».

Па выніках наглядных мерапрыемстваў неадпаведная патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў прадукцыя была знята з рэалізацыі і вернута пастаўшчыкам. Матэрыялы аб устаноўленых адміністрацыйных правапарушэннях перададзены ў судовыя органы. Імпарцёрам «рыбных кансерваў (ААТ «Гроднарыба») і піва (ЗЗАТ «Піваварня Хайнекен», г. Бабруйск) выдадзены прадпісанні аб арганізацыі вяртання гэтай прадукцыі спажыўцамі і (або) канфіскацыі яе з абароту».

Адначасова ў Віцебскай абласной інспекцыі Дзяржстандарта паведамілі, што ў першым паўгоддзі сёлета ў рэгіёне праведзена 68 праверак па выкананні патрабаванняў тэхнічных нарматыўных прававых актаў пры вытворчасці і рэалізацыі ў гандлёвай сетцы харчовай прадукцыі. Тады былі выяўлены парушэнні патрабаванняў па мікрабіялагічных, фізіка-хімічных і арганалептычных паказчыках, маркіроўцы; адсутнічалі дакументы аб пацвярджэнні адпаведнасці. Віцебскай абласной інспекцыяй Дзяржстандарта спынена пастаўка спажыўцам 491 партыі прадукцыі на суму звыш 2 млрд беларускіх рублёў і складзены 203 пратаколы аб адміністрацыйных парушэннях. Сума штрафу па гэтых пратаколах склала каля 257 млн рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — IT-СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ, ЭКАНОМІКА І ПРАВАЗНАЎСТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Незапоўненыя бюджэтныя месцы ёсць у Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце, Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту. Вельмі складаная сітуацыя склалася з запаўненнем месцаў у Міжнародным дзяржаўным экалагічным універсітэце імя Д. Сахарава, у Беларускім дзяржаўным аграрна-тэхнічным універсітэце, Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі…

Не дабралі абітурыентаў і многія педагагічныя спецыяльнасці. У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце не набралася дастатковай колькасці ахвотных вучыцца чатыры гады на настаўніка фізікі і матэматыкі: на 100 месцаў — 50 прэтэндэнтаў. Прычым сярод іх ёсць як уладальнікі вельмі нізкіх балаў (120 і менш), так і ўладальніца рэкорднай ва ўніверсітэце сумы ў 352 балы. Не запоўніліся і бюджэтныя месцы на факультэце пачатковай адукацыі. Затое на некаторых спецыяльнасцях у БДПУ конкурс склаў 2 чалавекі на месца.

У Мазырскім педагагічным універсітэце планавыя лічбы набору зусім невялікія. Тым не менш і тут бюджэтныя месцы засталіся без абітурыентаў. Так, на спецыяльнасці «Матэматыка і інфарматыка» на 10 месцаў прэтэндуюць 3 чалавекі, «Прыкладная матэматыка» — на 10 месцаў 5 чалавек, «Пачатковая адукацыя» — на 10 месцаў 6 чалавек.

У Магілёўскім дзяржаўным універсітэце адбыўся недабор на спецыяльнасцях «Біялогія і геаграфія» (10 прэтэндэнтаў на 15 месцаў), «Біялогія і хімія» (10 прэтэндэнтаў на 20 месцаў), «Матэматыка і інфарматыка» (7 прэтэндэнтаў на 13 месцаў), «Фізіка і інфарматыка» (усяго 2 прэтэндэнты на 12 месцаў).

**Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт спрацаваў на «дзесяць» балаў: як і летась, дзякуючы актыўнай прафарыентацыйнай рабоце ім удалося запоўніць усе свае бюджэтныя месцы, у тым ліку і на педагагічных спецыяльнасцях.**

У Віцебскім дзяржаўным універсітэце таксама ўзніклі праблемы менавіта з дакладнымі навукамі: «Прыкладная матэматыка» (10 заяў на 20 месцаў), «Матэматыка і інфарматыка» (8 заяў на 20 месцаў), «Фізіка» (навукова-вытворчая дзейнасць) — увогуле ніводнага прэтэндэнта на 23 месцы.

Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт і Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт — тая ж сітуацыя з дакладнымі навукамі. У Брэсцкім універсітэце 14 заяў на 30 месцаў на спецыяльнасці «Матэматыка і інфарматыка» і 1 заява на 15 бюджэтных месцаў па спецыяльнасці «Фізіка і інфарматыка».

У Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны сітуацыя выглядае наступным чынам: «Прыкладная матэматыка» 12 прэтэндэнтаў на 20 месцаў, «Матэматыка» (навукова-педагагічная дзейнасць) — 5 прэтэндэнтаў на 20 месцаў, «Фізіка» (навукова-педагагічная дзейнасць) — 2 прэтэндэнты на 20 месцаў, «Фізіка» (вытворчая дзейнасць) — 7 прэтэндэнтаў на 20 месцаў, «Фізічная электроніка» — 13 прэтэндэнтаў на 20 месцаў.

Амаль паўсюдна былі і праблемы з запаўненнем месцаў на беларускай філалогіі.

Шчыра здзіўляе тая акалічнасць, што колькасць платных месцаў на педагагічных спецыяльнасцях нярэдка перавышае колькасць бюджэтных месцаў, хоць і бюджэтныя месцы абітурыенты ігнаруюць сваёй увагай. А ў некаторых ахвотных стаць педагогамі сума балаў меншая за 80! Гэта, так бы мовіць, адзін бок медаля. Ёсць і другі: прывілеі ў выглядзе адмены ўступных іспытаў, якія сёлета атрымалі медалісты і пераможцы абласных алімпіяд пры паступленні на педагагічныя спецыяльнасці, усё ж такі прывялі і добра падрыхтаваных выпускнікоў: так, у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце без здачы экзаменаў падаў дакументы 71 абітурыент, з іх — 65 медалістаў.

### Зніжэнне прахадных балаў

А рэкардсменамі па прахадных балах сталі сёлета IT-спецыяльнасці, спецыяльнасці юрыдычнага і эканамічнага профіляў, дзе балы традыцыйна зашкальвалі. Эканамічныя спецыяльнасці запоўніліся ва ўсіх, нават няпрофільных, ВНУ, прычым паўсюдна склаўся конкурс. Больш як 300 балаў трэба было мець пры паступленні на большасць спецыяльнасцяў БДУ і БДЭУ. У БДУІР рэкорды ставіў факультэт камп'ютарных сістэм і сетак, дзе на спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» было зафіксавана 228 прэтэндэнтаў на 70 месцаў, а на спецыяльнасці «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» — 224 прэтэндэнты на 50 месцаў.

Сярэдні бал у медыцынскіх ВНУ вагаецца ад 250 да 300 і вышэй. Але ў так званых «мэтавікоў» у медыцынскіх ВНУ ўсё ж такі больш сціплыя балы ў сертыфікатах. Увогуле ж і на медыцынскіх, і на інжынерна-тэхнічных спецыяльнасцях у гэтым годзе адбылося зніжэнне прахадных балаў. Нават у БДУІР не ўсе спецыяльнасці па стане на 18 гадзін 12 ліпеня аказаліся запоўненымі. Але аўтаматызаваная сістэма, якая дзейнічае ў БДУІР, дазваляе карэктаваць залічэнне ў студэнты ў залежнасці ад расстаноўкі абітурыентамі прыярытэтаў і наяўнасці незапоўненых месцаў на тых ці іншых спецыяльнасцях. Такім чынам, у прыёмнай камісіі ёсць шанц запоўніць вакансіі, паколькі агульная колькасць заяў, пададзеных у БДУІР, істотна перавышае колькасць бюджэтных месцаў.

А вось Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт зноў спрацаваў на «дзесяць» балаў: як і летась, дзякуючы актыўнай прафарыентацыйнай рабоце ім удалося запоўніць усе свае бюджэтныя месцы, у тым ліку і на педагагічных спецыяльнасцях.

### Другі шанц стаць студэнтам

Галоўная інтрыга заключаецца сёння ў тым, ці будзе ўсё ж такі аб'яўлены дадатковы набор на вакантныя бюджэтныя месцы.

Дзякуючы новым правілам прыёму ў ВНУ стала магчымай другая ітэрацыя, або, прасцей кажучы, другая «хваля» залічэння. Калі месца засталося вакантным, яго могуць прапанаваць абітурыенту, які паступаў на іншую спецыяльнасць або ў іншую ВНУ, але не прайшоў там па конкурсе. Галоўнае, каб ён меў на руках патрэбны набор экзаменацыйных дысцыплін.

Таксама да конкурсу на вакантныя месцы могуць быць дапушчаны і абітурыенты, якія не набралі на цэнтралізаваным тэсціраванні ўстаноўленую мінімальную колькасць балаў. Для тых, хто будзе паступаць на бюджэтныя месцы ў рамках дадатковага набору, парог будзе зніжаны на пяць балаў: у сертыфікатах па рускай і беларускай мовах абітурыенты павінны будуць мець не менш як 5 балаў, па матэматыцы, фізіцы, хіміі і біялогіі — 10 балаў; 15 балаў — па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі найноўшага часу, грамадазнаўстве, геаграфіі і замежных мовах.

**У БДУІР рэкорды ставіў факультэт камп'ютарных сістэм і сетак, дзе на спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» было зафіксавана 228 прэтэндэнтаў на 70 месцаў.**

У Міністэрстве адукацыі абяцаюць прыняць рашэнне ў бліжэйшыя дні. Як заявіў падчас тэлеэфіру міністр адукацыі Сяргей Маскевіч, адказнае рашэнне будзе прымацца з улікам патрэбы той ці іншай галіны эканомікі ў канкрэтных спецыялістах, разам з урадам і Дзяржаўнай камісіяй падчас падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў. Пад увагу будзе брацца і тая акалічнасць, ці зможа паўплываць зніжэнне прахадных балаў на якасць падрыхтоўкі будучых спецыялістаў.

Прыём дакументаў на вакантныя месцы ў ВНУ сілавых ведамстваў будзе весціся з 21 па 25 ліпеня, у «творчых» ВНУ — з 27 па 28 ліпеня, ва ўсіх астатніх — з 23 па 28 ліпеня. Пасля правядзення другой «хвалі» залічэння на вакантныя бюджэтныя месцы абітурыенты змогуць падаваць дакументы на платную форму навучання (да 31 ліпеня). А 2 жніўня стануць вядомыя спісы залічаных на навучанне за ўласныя сродкі.

***Даведка «Звязды»:***

**У БДУ сумарны бал больш як 300 мае 1181 абітурыент, што складае 47% ад агульнай колькасці прэтэндэнтаў на бюджэтную форму навучання (усяго на 2081 бюджэтнае месца падалі дакументы 3057 чалавек).**

**Сярод тых, хто выказаў жаданне навучацца ў БДУ, 129 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд і конкурсаў. Акрамя таго, за права стаць студэнтам БДУ будуць змагацца 573 «залатыя» медалісты. На педагагічныя спецыяльнасці без экзаменаў будуць залічаны 28 пераможцаў абласных алімпіяд і школьных медалістаў.**

**Самы высокі конкурс зафіксаваны ў БДУ на наступных спецыяльнасцях і кірунках: «Камунікатыўны дызайн» (9,7); «Дызайн прадметна-прасторавага асяроддзя» — 6,3; «Правазнаўства (на скарочаную форму навучання) — 2,5; «Журналістыка» — 1,9. На ўсе гэтыя дысцыпліны абітурыенты здаюць трэці экзамен непасрэдна ва ўніверсітэце.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# СТЫХІЯ — СПРАВА ЗВЫЧАЙНАЯ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Толькі на ўскрайку паўночнага ўсходу Віцебскай і Магілёўскай абласцей будзе свяжэй, бо туды завітае антыцыклон з боку Ленінградскай вобласці Расіі. Там спецыялісты абяцаюць удзень плюс 21–23 градусы.

Эксперты гідраметцэнтра адзначаюць у ліпені вельмі няўстойлівы і экстрэмальны характар надвор'я. Напрыклад, у суботу на метэастанцыі Жыткавічы толькі за чатыры гадзіны выпала 88 літраў ападкаў на квадратны метр, што ажно на тры літры больш за месячную норму на ліпень. Разам з тым, на суседняй метэастанцыі ў Пінску дажджоў у гэты дзень увогуле не было зафіксавана.

### ПАДТАПІЛА МІНСК І ГРОДНА

Паводле інфармацыі службаў МНС, на тэрыторыі нашай краіны ў мінулыя выхадныя прайшлі моцныя ліўні. У нядзелю ў Першамайскім раёне сталіцы ў перыяд з 18.50 да 19.20 прайшоў моцны дождж. У выніку падтаплення з 19.29 да 20.27 быў прыпынены рух трох маршрутаў трамваяў на скрыжаванні вуліц Лагойскі тракт, Каліноўскага (глыбіня падтаплення — 150 см) і трох тралейбусных маршрутаў па вуліцах Кнорына, Каліноўскага (глыбіня падтаплення — 300 см).

У суботу і нядзелю ў Гродзенскім раёне і абласным цэнтры выпаў 41 мм ападкаў пры сярэднямесячнай норме 77 мм. Былі падтоплены 83 падворкі і склепы прыватных домаўладанняў, 23 будынкі аб'ектаў і арганізацый рознага прызначэння, 40 кватэр шматкватэрных жылых дамоў. У выніку падмывання грунту стварылася пагроза парушэння цэласнасці сцен і перагародак прыватнага жылога дома, размешчанага па вул. Спартакаўская. Паводле паведамленняў відавочцаў, былі пашкоджаны ўчасткі дарожных пакрыццяў 10 вуліц. Інфармацыя перададзена ў дарожныя арганізацыі. Вядуцца аднаўленчыя работы. У гэты час у Гродзенскім заапарку ў сувязі з падтапленнем клетак загінула 30 птушак: фазаны начавалі на зямлі, і іх проста накрыла хваляй вады.

Для ліквідацыі наступстваў у Гродне і раёне былі задзейнічаны 150 чалавек, больш за 30 адзінак тэхнікі выратавальнікаў і ЖКГ, дзясяткі мотапомп, у тым ліку камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Рамбудаўтадар». Падраздзяленнямі МНС і камунальнымі службамі аказана дапамога насельніцтву.



Фота БЕЛТА.

### ПАСВАВОЛІЎ І ВЕЦЕР

Паводле аператыўнай інфармацыі, па прычыне праходжання навальнічнага фронту з парывамі ветру (да 16 м/с) пацярпелі 6 населеных пунктаў у Гомельскай (Лельчыцкі р-н), Мінскай (Слуцкі і Бярэзінскі) і Магілёўскай (Быхаўскі і Крычаўскі р-ны) абласцях. Пашкоджаны дахі 6 жылых дамоў і 8 сельскагаспадарчых будынкаў. У Гродна па праспекце Я. Купалы паваленымі дрэвамі пашкоджаны тры легкавыя аўтамабілі. Аварыйнымі брыгадамі вядуцца аднаўленчыя работы.

Паводле інфармацыі аб'яднання «Белэнерга», на выхадныя на тэрыторыі краіны былі абясточаны 705 населеных пунктаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# МІНШЧЫНА РЫХТУЕЦЦА ДА ЖНІВА

**Пытанні падрыхтоўкі сельскагаспадарчых арганізацый цэнтральнага рэгіёна да жніва абмеркавалі на выязным пасяджэнні Мінаблвыканкама ў Смалявічах. Як адзначыў выканаўца абавязкаў старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Юрый Горлаў, масавая ўборка зерневых на Міншчыне пачнецца 20 ліпеня. Сёлета плануецца сабраць 2,2 млн тон зерня з улікам кукурузы.**

Як і ў мінулыя гады, сёлета на Міншчыне сутыкнуліся з праблемай кадраў. Напрыклад, на час правядзення ўборкі патрабуецца больш чым 10 800 механізатараў. Сёння іх працуе 9139 (84% ад патрэбнага). Недахоп будзе ліквідаваны за кошт работнікаў прамысловых прадпрыемстваў, навучэнцаў і практыкантаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, іншых арганізацый раёнаў і гарадоў вобласці.

— У нас ёсць усё неабходнае, каб якасна і своечасова ўбраць хлеб,— падкрэсліў Юрый Горлаў.— На Міншчыне налічваецца 2697 зернеўборачных камбайнаў розных марак. На днях парк папоўніцца яшчэ 80 камбайнамі. Сярэдняя нагрузка на адну машыну складзе 218 гектараў.

Старшыня Мінаблвыканкама Сямён Шапіра папярэдзіў кіраўнікоў арганізацый аграпрамысловага комплексу раёна аб прадастаўленні сапраўдных справаздачных даных і недапушчальнасці прыпісак.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**



■ Меркаванне

# МЭТЫ І СРОДКІ

## ЕЎРАЗІЙСКІ ЭКАНАМІЧНЫ САЮЗ У КАНТЭКСЦЕ ПАЛІТЫКІ ЗША

**Падпісанне дагавора аб стварэнні з 1 студзеня 2015 Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС), якое адбылося 29 мая, выклікала велізарную і цалкам заслужаную цікавасць ва ўсім свеце. Сёння рэалізуюцца планамерныя крокі па ўвасабленні ў жыццё асноўных яго палажэнняў з пачатку наступнага года. Палітыкаў і экспертаў Расіі, Беларусі і Казахстана не можа не насцярожваць адназначна негатыўнае стаўленне ЗША да фарміравання новага інтэграцыйнага аб'яднання. Узнікае натуральнае пытанне: у чым прычына такога непрымання ЕАЭС з боку амерыканцаў?**

Асноўны ўплыў цяпер на сусветную геапалітыку аказвае змяненне стратэгіі знешняй палітыкі ЗША. У Вашынгтоне перажываюць, што такія канкурэнты, як Еўрасаюз, Расія і Кітай, набіраюць сілу, якая аднойчы можа пазбавіць ЗША звыклай ролі сусветнага гегемона. Каб затармазіць развіццё канкурэнтаў, замест ранейшай ролі «сусветнага жандара» ЗША ў апошнія гады перайшлі да ролі «сусветнага правакатара беспарадкаў».

Злучаныя Штаты насаджаюць чужыя іншым краінам каштоўнасці і прыводзяць да ўлады ўрады, якія падвяргаюць рэзкаму перагляду традыцыйны распарадак жыцця. Такім чынам яны ствараюць нестабільную сітуацыю, у якой новыя ўрады залежаць ад падтрымкі амерыканцаў. Для таго, каб яны не перасталі залежаць ад падтрымкі ЗША, у рэгіёнах «раздзімаюцца» старыя канфлікты і ствараюцца новыя. Ва ўрадзе ЗША ёсць упэўненасць, што ачагі нестабільнасці, якія ствараюцца ўдалечыні ад амерыканскага кантынента, не перакінуцца на амерыканскую тэрыторыю. Але самае галоўнае — яны створаць патэнцыйным канкурэнтам, якія маглі б кінуць выклік Злучаным Штатам, мноства праблем, вырашэнне якіх паралізуе іх знешнепалітычную волю да глабальнага дамінавання.

У сітуацыі штучнай сусветнай нестабільнасці ЗША прадае нацыянальным дзяржавам свой фірменны тавар — бяспеку, якая падразумявае магчымасць забяспечыць падтрымку з боку самай буйной у свеце ваеннай машыны Вашынгтона ў абмен на ўступкі амерыканцам па важных для іх пытаннях.

Асаблівасці гэтай стратэгіі можна разгледзець на прыкладзе Еўрасаюза і Расіі. Уварванне ў Ірак і Афганістан, падзеі арабскай вясны 2011 года, заахвочванне амерыканцамі курсу Украіны на еўраінтэграцыю стварылі мноства выклікаў бяспекі на блізкіх подступах да Еўрасаюза і Расіі, пасварылі Брусель і Маскву, стварылі магутныя ачагі тэрарызму, бліжэйшай мэтай якіх з'яўляюцца перш за ўсё тэрыторыі ЕС і Расіі. Такім чынам ЗША спрабуюць штучна зацягнуць сваё геапалітычнае дамінаванне, ствараючы праблемы для патэнцыйных канкурэнтаў. Разуменне гэтага імкнення вашынгтонскіх эліт выклікала збліжэнне Кітая і Расіі і падтрымку Пекінам Масквы па сірыйскіх і ўкраінскіх пытаннях. Кітай бачыць спробы стварэння амерыканцамі для яго праблем у Паўднёвай і Усходняй Азіі і разумее асцярогі Расіі. Ёсць прыкметы таго, што ўсведамленне амерыканскіх планаў адбываецца і на тэрыторыі Еўрасаюза. Сігналам можна лічыць нядаўнюю прапанову Пуціна, Аланда і Меркель аб падаўжэнні перамір'я на тэрыторыі Украіны, якое ідзе насуперак з устаноўкамі Вашынгтона, і шпіёнскі скандал з агентамі ЦРУ на тэрыторыі Германіі.

У сувязі з падобнай сітуацыяй ЗША застаюцца асноўнай пагрозай для ЕАЭС. Любыя дамоўленасці з амерыканскім урадам, спробы знайсці агульныя інтарэсы ў пытаннях бяспекі або прадухіленні распаўсюджвання ядзерных матэрыялаў будуць нікчэмнымі для амерыканцаў, няхай на словах і заключаныя. Ключавымі інтарэсамі Вашынгтона ў Еўропе будзе стварэнне супярэчнасцяў паміж ЕС і Расіяй, дэстабілізацыя на тэрыторыі створанага Еўразійскага эканамічнага саюза. ЕС у выніку амерыканскіх планаў павінен адкінуць намеры па далейшай цэнтралізацыі ўлады, што магло б з цягам часу стварыць з ЕС звышдзяржаву, Расія — страціць амбіцыі па знешнепалітычным рэваншы і вярнуцца пад крыло ЗША, як гэта было пры Ельцыну. З гэтай мэтай тэрыторыі Украіны і Беларусі павінны стаць арэнай абвастрэння супярэчнасцяў паміж Расіяй і Еўрасаюзам, адначасова падвергнуўшы рызыцы пастаўкі расійскіх энергарэсурсаў у ЕС.

**У сітуацыі штучнай сусветнай нестабільнасці ЗША прадае нацыянальным дзяржавам свой фірменны тавар — бяспеку, якая падразумявае магчымасць забяспечыць падтрымку ў абмен на ўступкі амерыканцам па важных для іх пытаннях.**

Не меншыя праблемы могуць чакаць і Казахстан. Гэтая краіна з'яўляецца ключавым пунктам у Цэнтральнай Азіі, і яе дэстабілізацыя можа падарваць як ЕАЭС, так і ўплыў у рэгіёне Расіі. Дастаткова нестабільныя не толькі Афганістан і Пакістан, якія знаходзяцца побач, але і такія краіны. як Узбекістан, Кыргызстан і Таджыкістан. Не палягчае сітуацыю і тое, што ў Кыргызстана і Таджыкістана ёсць сур'ёзныя праблемы ў адносінах з Узбекістанам з-за спажывання водных рэсурсаў.

Зыходзячы з сённяшняй геапалітычнай сітуацыі, можна канстатаваць, што галоўнай знешнепалітычнай задачай Беларусі як краіны — члена ЕАЭС з'яўляецца садзейнічанне ў прымірэнні Расіі з Еўрасаюзам. Калі тэндэнцыя ўсведамлення дэструктыўных планаў ЗША будзе развівацца ў ЕС, у Беларусі і Еўрасаюза знойдзецца мноства пляцовак для супрацоўніцтва, у тым ліку не звязаных з Расіяй. Калі Еўрасаюз не зможа пераадолець сваю дэзарганізаванасць і залежнасць ад унутраных агентаў уплыву ЗША, то адносіны Расіі і ЕС застануцца абвостранымі, і роля Беларусі як эксперта па Расіі таксама будзе значная для Еўрасаюза.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■


Паритетбанк
www.paritetbank.by

**Открытое акционерное общество «Паритетбанк», (Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселева, 61а) сообщает, что 28 июля 2014 года *в соответствии с решением Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк» от 14.07.2014, протокол № 13,* проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме с повесткой дня:**

1. О внесении изменений в решение Общего собрания акционеров ОАО «Паритетбанк».
2. О признании утратившим силу Положения об отделе аудита ОАО «Паритетбанк».
3. О признании утратившим силу Положения об организации системы внутреннего контроля в ОАО «Паритетбанк».

Собрание проводится по адресу: г. Минск, ул. Киселева, 61а, комн. 205.

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного по состоянию на 16 июля 2014 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, будет проводиться при получении бюллетеней при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).

Получить бюллетени для заочного голосования и ознакомиться с материалами к собранию участники собрания могут по адресу: г. Минск, ул. Киселева, 61а, комн. 205 – 21 июля 2014 года и 22 июля 2014 года с 9.00 до 13.00 по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть возвращены не позднее 24 июля 2014 года по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров, дата подсчета голосов – 25 июля 2014 года.

Принявшими участие во внеочередном Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Паритетбанк» в указанном порядке, которые включаются в одноименный список.

Телефон для справок: 288 64 74.

*Правление ОАО «Паритетбанк».*

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 08.05.2013 г. № 5. УНП 100233809.


■ Добрая навіна

# РАБІЦЬ РАМОНТ СТАНЕ ПРАСЦЕЙ

**Магчыма, цяпер, каб замяніць падлогавае пакрыццё, змяніць, перанесці разеткі або паставіць змеявік у санвузле, рабіць праект і ўзгадняць яго з мясцовым выканкамам не давядзецца. Пра гэта, як паведамляюць Мінск-Навіны, на прамой лініі аб перапланіроўцы і перабудове жылых памяшканняў у Мінгарвыканкаме распавёў начальнік аддзела інжынернага суправаджэння аб'ектаў КУП «Мінскі гарадскі цэнтр інжынірынгавых паслуг» Валерый АСЯДОЎСКІ.**

Нагадаем: у маі мінулага года была прынята пастанова Савета Міністраў аб парадку перабудовы і перапланіроўкі ў кватэры. З яе вынікала, што на многія работы трэба браць дазвол у адміністрацыі раёна або, як мінімум, у ЖЭСе. Так, гэтая пастанова прадпісвала ўладальніку кватэры рабіць праект і браць дазвол у выканкаме на замену лінолеуму ламінатам або пліткай і перанос разетак-выключальнікаў у кватэры.

Цяпер камунальнікі вырашылі выключыць са спіса абавязковых узгадненняў гэтыя пункты. Праўда, выконваць работы ўсё роўна прыйдзецца з улікам тэхналогій. Калі падлога патрабуе выканання гукаізаляцыі, то гэта трэба будзе рабіць па ўсіх правілах. Кандыцыянеры і антэны таксама можна будзе ўстанаўліваць без распрацоўкі праектнай дакументацыі і без прыёмкі работ у эксплуатацыю.

Праект новай рэдакцыі пастановы цяпер знаходзіцца на ўзгадненні Саўміна.

**Святлана БУСЬКО**

■

■ Спорт-тайм

# «ДЫНАМА» АДРЫВАЕЦЦА АД БАТЭ

**Чарговая перамога «бела-блакітных», вікторыя пляжных футбалістаў і неверагодны поспех весляроў. У аб'ектыве «Звязды» — галоўныя спартыўныя падзеі краіны апошняга ўік-энда.**

**1. Зборная Беларусі па веславанні на байдарках і каноэ прывезла з чэмпіянату Еўропы 8 узнагарод** (4 залатыя медалі, 2 сярэбраныя і 2 бронзавыя). У выніку нашы суайчыннікі занялі ў агульнакамандным заліку трэцяе месца і прапусцілі наперад толькі венграў, гаспадароў спаборніцтваў, і немцаў. Узнагароды вышэйшага гатунку атрымалі Маргарыта Цішкевіч і Марына Літвінчук (байдаркі-двойкі, 200 метраў), Алег Юрэня (байдарка-адзіночка, 1000 м), Дзмітрый Рабчанка, Дзяніс Гаража, Дзмітрый Вайцішкін і Аляксандр Ваўчэцкі (каноэ-чацвёркі, 1000 м), Аляксандра Грышына і Соф'я Юрчанка (байдаркі-двойкі, 1000 м).

**2. Зборная Беларусі па пляжным футболе, якую трэніруе бразілец Жоао Коста, упершыню ў сваёй гісторыі згуляе ў суперфінале Еўралігі.** На чарговым этапе турніру, які прымала Масква, беларусы нечакана перайгралі Расію (4:2), паўнамоцных чэмпіёнаў свету, саступілі іспанцам (1:4) і перамаглі грэкаў (6:5). Нягледзячы на тое, што перад суперфіналам пройдзе яшчэ адзін этап, беларусы загадзя забяспечылі сабе месца ў вырашальным раўндзе. Матчы за трафей пройдуць у іспанскім гарадку Тарэдэмбара з 14 па 17 жніўня.



**3. Мінскае «Дынама» замацавалася на першай пазіцыі першынства краіны па футболе.** У 17-м туры сталічная дружына ў гасцях перайграла бабруйскую «Белшыну» (1:0). Брэсцкія дынамаўцы перамаглі «Слуцк» (2:1), «Гомель» і «Нафтан» (Наваполацк) падпісалі мірны дагавор (2:2), «Шахцёр» быў мацнейшы за «Нёман» (1:0), а «Мінск» з дапамогай абаронцы Сяргея Амельянчука, які вярнуўся на радзіму пасля 13-гадовага легіянерскага перыяду, набраў тры балы ў паядынку з «Дняпром» (1:0). У сваю чаргу, барысаўскі БАТЭ не здолеў на родным стадыёне перайграць жодзінскі «Тарпеда-БелАЗ» (1:1). Пасля чарговага тура мінскае «Дынама» з 41 балам адарвалася на тры ачкі ад БАТЭ. На трэцім месцы з 30 баламі ідзе «Шахцёр».

Дарэчы, сёння на «Барысаў-Арэне» падапечныя Аляксандра Ермаковіча распачнуць еўракубкавую праграму. У першым матчы 2-га кваліфікацыйнага раўнда Лігі Чэмпіёнаў «жоўта-блакітным» будзе супрацьстаяць албанскі «Скендэрбеў». Матч пачнецца ў 20:00. Прамую трансляцыю арганізуе афіцыяльны сайт БАТЭ і тэлеканал «Беларусь-5».

**4. Дзюдаістка Анжэла Марозава заваявала сярэбраную ўзнагароду** на этапе Еўрапейскага тура, які прымаў нямецкі Зіндэльфінген. У фінале вагавой катэгорыі да 70 кг Анжэла саступіла італьянцы Джэніфер Пітцанці.

**Тарас ШЧЫРЫ**

■


**ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПРОЦЕДУРЕ ПЕРЕГОВОРОВ ПО ТЕКУЩЕМУ РЕМОНТУ ОТМОСТКИ ЗДАНИЯ (16,2 м.кв), РЕМОНТУ ШТУКАТУРКИ (3,4 м.кв.), СМЕНЕ КЕРАМИЧЕСКОЙ ПЛИТКИ (1,6 м.кв.), ОКРАСКЕ ВОРОТ И РЕШЕТОК (34,85 м.кв.).**

Со сметной документацией можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. Сурганова, 48А, тел. 296-68-27.**

Просим сообщить о своем намерении участвовать в переговорах не позднее 17.07.2014.

УНП 101541722

# РАМАНТЫК З СУМНЫМІ ВАЧЫМА

Карэспандэнт «Звязды» знайшла ў Магілёве праўнучку вядомага савецкага артыста Пятра Алейнікава

**У дзень святых Пятра і Паўла ў шклоўскай вёсцы Крывель на Магілёўшчыне прыхільнікі таленту адной з самых яркіх «зорак» савецкага кінематографа Пятра Алейнікава сабраліся на яго стагадовы юбілей. Дарэчы, імя ён атрымаў у гонар аднаго з гэтых апосталаў. Можа, таму так шчодра ўзнагародзіў талентам хлопчыка з беднай шматдзетнай сям'і яго нябесны апякун. «Зорны» фільм Алейнікава «Трактарысты», падчас здымак якога ён на ўсё жыццё пасябраваў з самымі блізкімі яму па духу людзьмі — Барысам Андрэевым і Мікалаем Кручковым, прынёс артысту з беларускай глыбінкі шалёную папулярнасць. Нягледзячы на тое, што ён іграў далёка не станоўчую ролю, не ўлюбіцца ў гэтую шчырую ўсмешку і вялікія, крыху сумныя вочы было немагчыма...**


У Ганны такая ж шчырая ўсмешка, як і ў яе знакамітага прадзеда.

Нядаўна даведалася, што ў Магілёве жыве пляменнік Пятра Алейнікава. А калі пачала правяраць праз ЖЭУ №5 падказаны мне добрымі людзьмі адрас, зрабіла яшчэ адно адкрыццё. Да тэлефона нечакана паклікалі супрацоўніцу, якая аказалася праўнучкай Пятра Мартынавіча. Ганне Лабковай усяго крыху больш за 20 гадоў, і свайго знакамітага сваяка яна бачыла толькі на фота ды па тэлевізары. Калі мы з ёй сустрэліся, звярнула ўвагу на тое, што ў яе такая ж абаяльная ўсмешка і чымсьці падобныя вочы.

— Мая прабабуля Каця была яго роднай сястрой, — кажа дзяўчына. — Яна жыла недалёка ад Крывеля, у Княжыцах. Я там усё сваё дзяцінства правяла. Радні па лініі Алейнікавых у тых краях шмат. І прозвішча вельмі распаўсюджанае. Напэўна, таму і не звярнула ўвагу на тое, што на ўчастку, дзе я працую майстрам, сапраўды жыве чалавек з гэтым прозвішчам. Трэба будзе бліжэй пазнаёміцца з ім.

А вось старшыні Магілёўскага гарадскога савета ветэранаў Фёдару Мацькову пашчасціла нават сустрэцца з артыстам дзесьці ў канцы 1950-х — пачатку 1960-х гадоў. Калі ён прыехаў у шклоўскую вёску Фашчаўка адведаць свайго дзядзьку Паўла Сякацкага, вельмі здзівіўся, убачыўшы замест гаспадара з жонкай двух незнаёмых мужчын. Тое, што гэта вядомыя артысты Пётр Алейнікаў і Барыс Андрэеў, неяк не верылася. А тыя спакойна сядзелі за сталом, пілі каньяк і закусвалі салам і сырымі яйкамі. Як высветлілася, дзядзька, на той момант дырэктар мясцовай школы, даведаўшыся пра візіт знакамітых асоб, запрасіў іх да сябе, каб увечары арганізаваць у школе кінапрагляд і пазнаёміць аднавяскоўцаў з «зоркамі» тэлебачання. Пакуль усе былі на працы, ён пакінуў іх у хаце адных.

Фёдар Мацькоў усміхаецца, калі ўзгадвае, як Пётр Мартынавіч на правах часовага гаспадара ўчыніў яму «допыт», а потым міралюбна запрасіў далучыцца да іх кампаніі. Нават штрафную чарку каньяку наліў. А потым яшчэ і праэкзаменаваў: «А ці ведаеце вы паэзію?» Малады хлопец не разгубіўся і добрасумленна пачаў дэкламаваць свайго любімага Сяргея Ясеніна. Артыст усміхнуўся і ўслед за ім падхапіў добра вядомыя яму радкі.

А пасля, увечары, яны разам з дзядзькам і цёткай яшчэ доўга сядзелі за сталом, размаўлялі. Успаміналі, як у Крывелі адбылася прым'ера «Трактарыстаў». Калі Алейнікаў з'явіўся на экране, ураджаныя землякі паўскоквалі з месцаў і закрычалі: «Глядзіце, гэта ж наш Пецька, Мартынаў сын!» Шмат чаго ўспамінаў артыст са свайго бязрадаснага дзяцінства. Казаў пра тое, як маці прымушала яго са старэйшай сястрой жабраваць. Бацька памёр, а 6 дзяцей не было чым карміць. Не ад добрага жыцця хлопец краў, бадзяўся. Падлеткам пешшу дайшоў аж да Шклова, дзе ўпершыню ўбачыў вялікае кіно. У мясцовым парку па вечарах круцілі фільмы, і ён усімі праўдамі і няпраўдамі прарываўся туды. А ў магілёўскай калоніі, куды ён у выніку трапіў, нават кіраваў драмгуртком. Першыя яго рэжысёры былі ў захапленні ад таленту юнака, таму, калі ён адправіўся вучыцца «на артыста» ў Ленінград, у яго ўжо быў з сабой цэлы пачак рэкамендацыйных пісем.

— Калі Пётр Алейнікаў расказваў пра сваё цяжкае дзяцінства, у яго станавіліся вільготнымі вочы, — кажа Фёдар Мацькоў. — І гэта было так шчыра, што і астатнім хацелася рыдаць. Але толькі ён успамінаў нешта смешнае, як яго твар пачынаў ззяць. Гэта было неверагоднае пераўвасабленне. Нават Барыс Андрэеў не мог адарваць вачэй ад сябра. І не пераставаў паўтараць: «Вы не ведаеце, наколькі таленавіты нарадзіўся на вашай зямлі чалавек».

Калі артысты прыйшлі на мясцовы вадаём, разявакі збегліся з усёй акругі. Азярцо было невялікае, але краснапёркі там аж кішэлі. На жаль, вудачак не было, але гасцінны гаспадар знайшоў недзе для артыстаў сеткі з абадком — так званыя «таптухі». І Пётр Алейнікаў з Барысам Андрэевым у адных плаўках гойсалі па вадаёме, ледзь паспяваючы цягаць рыбу. Потым варылі юшку на вогнішчы. А яшчэ паўвядра артыст павёз у Крывель, каб пачаставаць землякоў.

Таго дома, дзе нарадзіўся Пётр Алейнікаў, ужо няма. Але на яго месцы пабудавалі новы на тым жа падмурку. Сёння тут адкрыты музей артыста. Аб тым, каб ён з'явіўся, паклапаціўся яшчэ Аляксандр Лукашэнка. Тады ён быў дырэктарам мясцовага саўгаса «Гарадзец». Загадчыца музея Таццяна Рыданава ўспамінае, як Аляксандр Рыгоравіч удакладняў у яе маці, дзе непасрэдна жыў Алейнікаў. Садзейнічаў таму, каб у вёсцы з'явілася добрая асфальтавая дарога і добраўпарадкавалі калодзежы. Дарэчы, маці Таццяны Уладзіміраўны, Тамара Давідовіч, прымала актыўны ўдзел у стварэнні этнаграфічнай экспазіцыі для гэтага музея, якая адлюстроўвае быт вяскоўцаў тых часоў, калі Пётр Алейнікаў рабіў першыя крокі ў жыццё.


Фёдар МАЦЬКОЎ вельмі ганарыцца тым, што меў магчымасць убачыцца з Пятром Алейнікавым.

Сюды на дзень нараджэння кожны год збіраюцца родныя артыста, прыхільнікі яго таленту, аднавяскоўцы. На жаль, сын акцёра, Тарас, памёр, а вось дачка Арына, кажуць, дзесьці ў Амерыцы. У 1970-я гады яна прыязджала сюды разам са здымачнай групай, якая стварала фільм пра яе «зорнага» бацьку «Пётр Мартынавіч. Гады вялікага жыцця». Дарэчы, менавіта з гэтага фільма пачалася сёлетняя сустрэча. З асабістых рэчаў артыста захаваліся яго незвычайныя малюнкі, а дакладней накіды, якія ён алоўкам або ручкай рабіў проста на лістах сцэнарыяў. І найбольш цікавы з іх малюнак, дзе ён свайго маленькага сына ўявіў 70-гадовым старым. Неверагодна, але, калі 60-гадовы Тарас Алейнікаў прыязджаў у Крывель, усе адзначылі гэтае дзіўнае падабенства. Нездарма кажуць, што калі чалавек таленавіты, ён таленавіты ва ўсім.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**

# МЕКСІКАНЕЦ ПАКАРЫЎ ВІЦЕБСК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

Выступаў на фестывальных і конкурсных пляцоўках краін Амерыкі і Еўропы. Радрыга — двойчы уладальнік «Залатога мікрафона» Нацыянальнай асацыяцыі радыёвяшчання Мексікі. Па версіі выдання «The Mexican Sun» прызнаны «Персонай года-2010». Мае медаль урада Эквадора за артыстызм, медаль Аўгустына Лара і Нацыянальную ўзнагароду радыёвяшчання Мексікі. Запісаў аж сем студыйных альбомаў.

Паводле слоў **Кіма Брэйтбурга, старшыні журы конкурсу, заслужанага дзеяча мастацтваў Расіі, кампазітара, прадзюсара,** каб перамагчы ў конкурсе, трэба не толькі валодаць добрым голасам:

— У мяне ёсць сваё меркаванне, стаўленне да канкурсантаў. Я ацэньваю іх па некалькіх параметрах: не толькі за голас, але і за артыстызм, тэмперамент. Конкурсаў шмат у свеце праводзіцца, але адзінкі з тых, хто атрымаў нейкія месцы, прызы, дыпломы, становяцца сапраўднымі артыстамі. І я лічу, што задача журы, асабліва на такіх буйных міжнародных фестывалях, — дапамагчы рэалізавацца найбольш таленавітым, перспектыўным. Конкурс у нас не спартыўны. І мне не важна, якую ноту сёння ўдала ўзяў канкурсант, наколькі гучна выканаў. А вось ці здолееў ён зрабіць уздзеянне на мяне на эмацыянальным узроўні, калі выступаў на сцэне, — іншае пытанне. Калі не зачапіў, не магу яму паставіць высокую ацэнку, для мяне пустое месца ўсе яго вакальныя даныя. Галоўнае — сукупнасць якасцяў: інтэлект, высокая культура (адразу відаць па чалавеку, хто перад намі, ці знайшоў кантакт з залай), уменне мець зносіны, абаянне, адкрытасць.

# ДА СУСТРЭЧЫ, «СЛАВЯНСКІ БАЗАР»!

**Гэтай ноччу завяршыўся 23-ці па ліку міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».**

Сёлетні фестываль, як заўважылі старажылы горада, многія яго ўдзельнікі, запомніцца надоўга. І гэта — дзякуючы новым праектам, новаму падыходу да правядзення конкурсу маладых выканаўцаў. А сцэна амфітэатра ўразіла ўсіх, хто знаходзіўся ў зале ці глядзеў трансляцыі па тэлебачанні. А яшчэ прыемна здзівіла тое, што падчас «базару» не было лівеняў, якія «наведвалі» фестывальны горад штогод.

Прадстаўнікі каля 30 краін свету бралі ўдзел у гэтым фэсце. Гасцінны Віцебск практычна кругласутачна фестываліў. Некаторыя канцэрты ў летнім амфітэатры — на галоўнай сцэне «базару» — завяршаліся пад раніцу. У цэнтры горада кірмашы, вулічныя кавярні працавалі і ноччу. Як падлічылі ў аблвыканкаме, штодня падчас «базару» тавараазварот павялічваецца мінімум у 10 разоў.

Зладжана папрацавала каманда арганізатараў фестывалю. У дырэкцыі зрабілі ўсё магчымае, каб самыя капрызныя «зоркі» засталіся задаволенымі знаходжаннем на адным з самых вядомых у свеце культурных праектаў. І гараджанам, і не «зорным» гасцям горада было камфортна.

Па добрай традыцыі, праца над падрыхтоўкай да чарговага «базару» пачынаецца адразу пасля заканчэння мінулага. І цяжка ўявіць, што калісьці ў Віцебску не было такога маштабнага мерапрыемства. Такое ўражанне, што фестываль заўсёды быў, ёсць і, безумоўна, будзе!

Фэст афіцыйна закрыўся, але і сёння, і заўтра праходзяць канцэрты, прэзентуюцца забаўляльныя праграмы. Такім чынам, «базар» па-ранейшаму правіць баль.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

■ Беражыце сябе!

# У ГРЫБЫ ЦІ ПА ЭКСТРЫМ?

Захоплена збіраючы дары лесу, не забывайцеся арыентавацца на месцы

**Пераменлівае надвор'е, якое апошнім часам усталявалася ў Беларусі, многім зусім не па душы. Многім, але не грыбнікам: цёплыя дажджы і спёка пасля іх прымушаюць аматараў збору гэтых дароў прыроды тысячамі выходзіць на «паляванне». Звычайна грыбнікі наведваюць так званыя «свае мясціны», пра ўраджайнасць якіх яны даўно ведаюць. Але часам «грыбное надвор'е» заспявае людзей у нечаканых месцах. І тады шанцаў на пераўтварэнне звычайнага паходу ў лісічкі ці баравікі ў экстрэмальную вандроўку становіцца ў разы больш.**




62-гадовы мінчанін Генадзь некалькі гадоў таму набыў сабе ўчастак у Пухавіцкім раёне для летняга адпачынку. Заўзяты грыбнік не мог не скарыстацца надвор'ем і разам з шасцігадовым унукам на ўласным аўтамабілі выправіўся ў лес раніцай 29 чэрвеня.

Грыбоў дзядуля з унукам так і не назбіралі: дзе-нідзе з зямлі выторкваліся зусім маленькія лісічкі, але такога «ўлову» не хапіла б нават на добры суп. Грыбнікі пачалі збірацца дадому. Зваротны шлях да машыны яны вырашылі скараціць. Але неўзабаве зразумелі, што аўтамабіля на гарызонце не відаць, а лес вакол іх не выглядае знаёмым.

— Я адразу пачаў перажываць, — расказвае Генадзь, — у першую чаргу, за свайго ўнука. Усё ж такі надвор'е было вельмі спякотнае, і я баяўся, што хлопцу стане млосна ці нешта яшчэ здарыцца. Акрамя таго, з дзіцем не палезеш «напралом» праз гушчар. Таму прыйшлося шукаць іншае выйсце.

Адзіным сродкам сувязі з цывілізацыяй у дзядулі і ўнука заставаўся мабільны тэлефон. Генадзь пазваніў у мясцовае лясніцтва і паведаміў, што заблудзіўся. Але зарыентаваць лесаводаў на пошук не атрымалася, бо грыбнікі аказаліся заціснутымі паміж двума асушальнымі каналамі даволі вялікай глыбіні. «Фарсіраваць» іх з маленькім унукам Генадзь не рызыкнуў.

Спецыяльнага абсталявання для пошуку людзей у леснікоў, вядома, не было. А час няўмольна бег. Пачынала цямнець. Пры дапамозе таго ж тэлефона грыбнікі звязаліся з мясцовым аддзелам МНС і папрасілі дапамогі. План выратавання быў такі: у лясны масіў прыязджала пажарная машына і пачынала сігналіць. Гэты гук і станавіўся галоўным арыенцірам для Генадзя. Нарэшце, прыкладна а 12-й гадзіне ночы, грыбнікі змаглі выйсці да машыны МНС.

— Безумоўна, такі выпадак стаў для мяне добрай навукай, — кажа Генадзь, — бо я нават не чакаў, што магу заблукаць у лесе. Так, я вырас у горадзе, але ўсё сваё жыццё хадзіў у грыбы ў самыя розныя, у тым ліку незнаёмыя лясы. Ці перастану я збіраць грыбы? Безумоўна, не. Але маленькіх унукаў з сабой браць ужо дакладна не буду. Хачу засцерагчы іншых грыбнікоў ад маіх памылак і абавязкова аддзячыць пухавіцкім выратавальнікам за дапамогу.

Гісторыя Генадзя скончылася «хэпі-эндам», але ўсё магло быць інакш, калі б у грыбнікоў не было з сабой мабільнага тэлефона. Ды і ён не заўсёды гарантуе выратаванне: тэрмін аўтаномнай працы сучасных смартфонаў значна меншы за простыя сотавыя і звычайна не перавышае 1 дзень.

Тое, што паход у грыбы можа скончыцца сумна, пацвярджае і выпадак, які здарыўся ў Баранавіцкім раёне літаральна за 3 дні да апісаных вышэй падзей. 75-гадовы пенсіянер адправіўся ў лес і не вярнуўся. Да яго пошуку падключылі мясцовых праваахоўнікаў і вайскоўцаў. Вечарам таго ж дня цела гэтага мужчыны знайшлі ў гушчары. Відавочна, здароўе грыбніка не вытрымала спёкі і фізічных нагрузак.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

# ДЗЯДУЛЮ ЗНАЙШЛІ Ў БАГНЕ

**Ледзь не скончыўся трагедыяй паход 78-гадовага мінчаніна ў асіповіцкі лес у ягады. Аб тым, што стары заблукаў, ратавальнікам у 8 гадзін вечара паведаміла яго дачка. На пошукі пажылога чалавека разам з супрацоўнікамі МНС адправіліся і міліцыянеры.**

— Сувязь з пенсіянерам падтрымлівалі па мабільным тэлефоне, але мужчына не знаходзіўся на месцы і кудысьці ўвесь час перамяшчаўся: напэўна, спадзяваўся, што знойдзе дарогу сам, — паведаміў падрабязнасці **начальнік аддзялення УУС Магілёўскага аблвыканкама Дзмітрый ІГНАТОВІЧ.** — Потым, калі ў 3 часы ночы сувязь з ім абарвалася зусім, на пошукі быў накіраваны ўвесь асабісты склад Асіповіцкага РАУС. І толькі ў 7.30 раніцы пенсіянер быў знойдзены. Ён заграз у багне і самастойна выбрацца адтуль не мог. З дапамогай ратавальнікаў яго выцягнулі з гэтай пасткі і даставілі дадому. На шчасце, здароўю мужчыны нічога не пагражае.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**



■ Ну і ну!

# КРАДЗЕЖ З «БАБУЛІНАГА ДВОРЫКА»

З Гродзенскага заапарка знікла насуха, але яе ўжо вярнулі «дахаты»

**У Гродзенскім заапарку адбылося беспрэцэдэнтнае здарэнне: укралі дзіцяня насухі — маленькага пушыстага звярка з доўгім носам і паласатым хвастом. Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама, за крадзеж жывёлы завялі крымінальную справу ў дачыненні да 42-гадовага гродзенца.**


Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.
Ветурач заапарка Алена НЕРАД радуецца, што гадаванка вярнулася.

На тэрыторыі заапарка мужчыну зацікавіў так званы «Бабулін дворык», дзе ўтрымліваюцца бяскрыўдныя для наведвальнікаў жывёлы «дзіцячага» ўзросту, у тым ліку і насухі. У асноўным туды прыходзяць дзеці, але не забараняецца і дарослым. Як і гэтаму мужчыну, які, па словах відавочцаў, доўга гладзіў звярка, размаўляў з ім. А потым, калі жывёл пералічвалі, аказалася, што знікла адно дзіцяня насухі.

Намеснік дырэктара Гродзенскага заапарка Віталь Гуменны кажа, што ў «Бабулін дворык» ёсць асобны ўваход, які зачыняецца. Крадзяжоў адтуль ніколі не было. Калі ласка, можна пагладзіць жывёлу, пагуляць з ёй...

Спачатку, калі пасля пераліку насельнікаў «Бабулінага дворыка» высветлілася, што аднаго з дзіцянят насухі не хапае, думалі, што яно некуды збегла. Але не выключалі і крадзеж, што пацвердзілася пры знаёмстве з аб'явамі ў інтэрнэце. Тым жа вечарам была змешчана аб'ява аб продажы жывёлы, якая па апісанні была падобнай на насуху з Гродзенскага заапарка. А потым аператыўна спрацавалі праваахоўнікі з Ленінскага райаддзела міліцыі Гродна: ужо на наступны дзень насуху вярнулі ў заапарк.

— За гэта я ўдзячны работнікам нашай ветслужбы і следчым, якія аператыўна затрымалі зламысніка (па маёй інфармацыі, на продажы жывёлы ён хацеў зарабіць каля 600 долараў), паколькі паўтарамесячнае дзіцяня насухі знаходзілася на спецыяльным рэжыме кармлення. Яму не падыходзіць звычайнае малако з крамы, патрэбны пэўныя вітамінныя дабаўкі. Як высветлілася, жывёлу ўсё ж паспелі пакарміць магазінным малаком, але, на шчасце, адмоўных наступстваў з-за парушэння рэжыму харчавання пакуль не назіраецца. Дзіцяня насухі, што ім уласціва, паводзіць сябе вельмі актыўна, добра есць, — кажа Віталь Гуменны.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■ Цікавы факт

# АЙЧЫННЫЯ ЧЫПСЫ — З АЙЧЫННАЙ БУЛЬБЫ?



Адзін з сельскагаспадарчых вытворцаў гатовы пачаць выраб сыравіны для папулярнага прадукту

**Днямі на сайце газеты «Гомельская праўда» з'явілася інфармацыя аб тым, што пад Гомелем будуць выраблячь часночныя чыпсы. Гэтае паведамленне зацікавіла нашага карэспандэнта, і ён вырашыў удакладніць, як такія чыпсы будуць выглядаць.**

Высветлілася, што нават паняцця «часночныя чыпсы» не існуе. У невялічкай нататцы паведамлялася, што на камунальным сельскагаспадарчым унітарным прадпрыемстве «Камбінат «Усход» у Гомельскім раёне плануюць стварыць першы ў Беларусі цэх па прамысловай перапрацоўцы часнаку. Са спасылкай на генеральнага дырэктара абласной асацыяцыі вытворцаў плодаагародніннай прадукцыі Валерыя Папкова, гаварылася: «...праект будзе рэалізаваны ў некалькі этапаў — яго першую чаргу запусцяць ужо сёлета. Памер чаканых інвестыцый складзе каля 10 мільярдаў рублёў. Сёння ўжо праводзяцца тэндары па закупцы неабходнага абсталявання. Як чакаецца, цэх будзе выпускаць часночную муку і эфірныя алеі, чыпсы, часнок у замарожаным выглядзе і іншую прадукцыю».

Усё, у прынцыпе, правільна. Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» на камбінаце «Усход», новы цэх і сапраўды збіраюцца ствараць. Аднак асноўны кірунак дзейнасці ў гэтым цэху — бульбяныя камякі, якія выкарыстоўваюцца потым для вытворчасці чыпсаў. Перапрацоўка часнаку таксама запланавана, але з-за ненадзейнасці гэтай культуры (не кожны год можна разлічваць на добры ўраджай) арыентавацца толькі на яе нельга. Прадпрыемства ў першую чаргу думае аб тым, каб атрымаць прыбытак і не застацца «ў мінусе». Таму і спрабуе пашырыць спектр сваёй дзейнасці: акрамя вырошчвання садавіны і гародніны, а таксама жывёлагадоўлі, там займаюцца і рознымі відамі перапрацоўкі сваёй жа прадукцыі (маюць кансервавы, мясны цэх і іншыя). Акрамя таго, камбінат вырошчвае сваю рыбу. Вось толькі ўсім гэтым нікога сёння не здзівіш: далёка не ўсе сельгаспрадпрыемствы спецыялізуюцца толькі на адным відзе дзейнасці. «Мы павінны выжываць, — гавораць на прадпрыемстве. — І цяпер знайшлі такую нішу на нашым рынку — вытворчасць бульбяных камякоў».

Прадпрыемства вырошчвае бульбу на 1000 га зямлі. Калі будуць праблемы з рэалізацыяй самой бульбы, то заўсёды можна яе перапрацаваць на камякі, якія, між іншым, з'яўляюцца імпартазамяшчальным прадуктам. Справа ў тым, што айчынныя вытворцы чыпсаў выкарыстоўваюць замежную сыравіну, спасылаючыся на неадпаведнасць нашай бульбы для падобнай вытворчасці. «Мы імкнёмся замяніць імпарт, — паведамляюць на камбінаце. — Лінія вытворчасці, якую мы хочам набыць (для чаго ўжо праводзім тэндар), вельмі дарагая, але адпавядае ўсім еўрапейскім стандартам. Спадзяёмся, што ў нас атрымаецца працаваць эфектыўна. Мы лічым, што зможам канкурыраваць».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■ Здарэнні

# АМФІБІЯ МІМАВОЛІ

**У мінулую суботу выратавальнікам з Віцебска прыйшлося вырашаць незвычайную задачу. Мужчына 1983 года нараджэння прыехаў у вёску Хацінічы на бераг Заходняй Дзвіны, каб парыбачыць. Пакуль рыбак займаўся сваімі справамі, яго аўтамабіль крануўся з месца і пакаціўся проста ў раку.**

Выратавальнікі, якія прыбылі на месца здарэння, высветлілі, што «Фольксваген-Пола» 2000 года выпуску знаходзіцца ў Дзвіне на пяціметровай глыбіні, за дзесяць метраў ад берага. Існавала верагоднасць, што паліва з аўтамабіля патрапіць у раку. Намаганнямі вадалазнай службы пажарнага аварыйна-выратавальнага атрада «Фольксваген» быў падняты на паверхню, а потым — і на бераг. Зроблена гэта было пры дапамозе надзіманых пантонаў.



Па словах прэс-сакратара Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС Марыны ФАНДО, пакуль невядома, ці знаходзіцца аўтамабіль у працоўным стане пасля такой «вандроўкі» на дно ракі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**

# БЕЗ БЕЛЫХ ПЛЯМ

## Унук генерал-маёра Івана Лазарэнкі збіраецца напісаць кнігу аб невядомых старонках жыцця свайго гераічнага дзеда

**Прозвішчам гэтага палкаводца названы вуліцы і скверы ў розных гарадах. Яго ведаюць як мужнага і бескампраміснага чалавека, але амаль 70 гадоў ён па дакументах лічыўся здраднікам. І толькі дзякуючы ўнуку, чатыры гады таму Вярхоўны суд Расіі рэабілітаваў гэтага героя.**


Рыгор ЛАЗАРЭНКА напіша сваю кнігу.

На думку Рыгора Лазарэнкі, дзед яго трапіў у гэтыя жорны толькі таму, што камусьці проста трэба было неяк апраўдаць тыя паражэнні Чырвонай Арміі, якія яна несла на пачатку вайны. І кніга, якую ён збіраецца выдаць, стане сапраўднай споведдзю чалавека, перажыўшага жорсткія выпрабаванні. У яе ўвойдуць копіі дакументаў, успаміны відавочцаў, рэдкія фотаздымкі — усё тое, што ўдалося сабраць нашчадкам Івана Лазарэнкі за некалькі дзясяткаў гадоў. Аб тым, чаго каштавала змыць ганьбу з імені генерала, наша размова з Рыгорам Рыгоравічам Лазарэнкам.

### Кампетэнтна

У 1941 годзе Іван Лазарэнка, адзін з абаронцаў Брэсцкай крэпасці, трапіў у спіс генералаў, якіх абвінавацілі ў разгубленасці і бяздзейнасці ў першыя хвіліны вайны. Удзельнік 4 войнаў, поўны Георгіеўскі кавалер, быў пазбаўлены звання і ўсіх узнагарод і прыгавораны да расстрэлу. І толькі ў апошні момант вышэйшую меру пакарання замянілі на 10 гадоў лагераў. Але праз год з лішнім, калі пад Ржэвам трэба было прарваць нямецкую абарону, Сталін сам успомніў пра разжалаванага генерала і патрабаваў адправіць яго на фронт. Таленавіты палкаводзец хутка вярнуў свае рэгаліі, але дажыць да Перамогі яму не было суджана: у чэрвені 1944 года ён загінуў падчас прарыву абароны праціўніка на падыходах да Магілёва. У тым жа 44-м яму было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

### Сын

Рыгор Іванавіч Лазарэнка рана страціў маці і з 7 гадоў знаходзіўся на выхаванні бацькі. Да таго самага часу, пакуль не паступіў у Арлоўскае танкавае вучылішча. У фінскую вайну сын і бацька ўжо ваявалі разам. Як і ў 1941-м, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Старэйшаму Лазарэнку было 45 гадоў, малодшаму — 26. Адзін — бывалы генерал-маёр, другі — малады начальнік штаба танкавага батальёна. Калі бацьку арыштавалі, сына прымушалі адрачыся ад яго. Не зламацца дапамог палкоўнік штаба бранятанкавых войскаў Рыгор Клейн, якога Іван Лазарэнка да вайны выратаваў ад расстрэлу. Рыгор Іванавіч сустрэў яго на парадзе 7 лістапада 1941 года — напярэдадні наступальнай аперацыі пад Масквой. І той употай паведаміў: «Нікому не вер, твайго бацьку не расстралялі».

Ад бацькі, як і ад яго прозвішча, сын не адрокся. І да 1944 года не атрымаў ні адной узнагароды, акрамя медаля «За абарону Масквы». Затое пасля гераічнай гібелі генерала за няпоўны год яму ўручылі адразу 5 ордэнаў, не лічачы медалёў. Калі ён паспрабаваў вярнуць бацькоўскія ўзнагароды, яго наогул не прызналі сынам генерала. Прыйшлося яшчэ даказваць і сваё сваяцтва. У дамашнім архіве ўнука захаваўся цікавы дакумент з радзімы яго дзеда — пацвярджэнне Валаконаўскага раённага Савета народных дэпутатаў у тым, што Іван Сідаравіч і Рыгор Іванавіч — сапраўды бацька і сын.

**24 лютага 2010 года Вярхоўны суд РФ адмяніў рашэнне Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР ад 17 верасня 1941 года і рэабілітаваў Івана Лазарэнку. Было прызнана, што дзеянні камандзіра 42-й стралковай дывізіі «не ўваходзілі ў супярэчнасць з патрабаваннямі кіруючых дакументаў, якія існавалі ў той момант, і адпавядалі абстаноўцы і атрыманым ад штаба корпуса загадам».**

Пасля вайны сын спрабаваў вярнуць бацьку добрае імя. Нават скончыў гістфак, каб прафесійна разабрацца ў пытанні. Пасля дэмабілізацыі выкладаў у Магілёве гісторыю, працаваў у школах №2 і №12. Ён ведаў вайну не па кніжках, але менавіта гэтая тэма заставалася для яго самай цяжкай. Калі музей Брэсцкай крэпасці збіраў матэрыял аб яе абаронцах, яго ўспаміны таксама запісалі. Але яны не былі надрукаваны.

### Унук

У Магілёве Рыгора Рыгоравіча Лазарэнку ведаюць як добрага хірурга, намесніка ўрача гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, але мала хто — як унука знакамітага генерала. Ён не пайшоў па слядах дзеда і бацькі, але прызванне ратаваць людзей, напэўна, у іх сямейнае. А яшчэ — пачуццё справядлівасці і прыстойнасці.

— Чым больш знаходзіш фактаў, якія пацвярджаюць, як несправядліва абышліся з дзедам, тым цяжэй робіцца на душы, — прызнаецца ён. — Ці магчыма такое сумленнае служэнне Айчыне? Пасля ўсяго, што яму прыйшлося перажыць, ён застаўся верны прысязе і Радзіме, а вось савецкія гісторыкі пабаяліся напісаць праўду аб ім. Сяргей Смірноў, аўтар кнігі «Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці», шчыра сказаў майму бацьку: «Калі я напішу, як было на самой справе, кніга ў свет не выйдзе». Але я ўсё роўна яго паважаю ўжо толькі за тое, што ён закрануў тэму Брэсцкай крэпасці. Пра яе доўгі час баяліся пісаць. Сталін і яго кіраўніцтва лічылі, што там былі спрэч адны здраднікі.

Тое, што Іван Лазарэнка — шчыры і мужны чалавек, унук ведаў заўсёды. Але вакол яго імені чамусьці заўсёды было шмат хлусні. Пачынаючы з Брэсцкай крэпасці і заканчваючы смерцю.

— Я размаўляў са сведкам гібелі дзеда — Яўгенам Раманавым, салдатам з яго аховы, — распавядае суразмоўца. — Некаторыя і цяпер лічаць, што ў «Віліс», у якім ехаў Лазарэнка, трапіў снарад. Гэта не так. Іван Сідаравіч загінуў як сапраўдны воін, каля гарматы. Пасля вызвалення Чавусаў яго дывізія працягвала імклівае наступленне. Адзін з батальёнаў трапіў у нямецкую засаду. Гукі стрэлаў блізкага бою камдыў пачуў, калі размаўляў з мясцовымі наконт броду цераз Расту. Разам з Раманавым яны ўскочылі ў машыну і панесліся ў той бок. Прыкладна за кіламетр ад вёскі Халмы ўбачылі напалову выбіты артылерыйскі разлік. Лазарэнка замяніў параненага наводчыка, а Раманаў падаваў боепрыпасы, пакуль у гармату не трапіў нямецкі снарад. Камдыў загінуў, а Раманаву адарвала руку.

### У пастцы

Брэсцкая крэпасць была пабудавана ў пачатку XIX стагоддзя і ў тыя гады лічылася вельмі магутным абарончым збудаваннем. Але ў 1941-м у якасці стратэгічнага пункта яна сур'ёзнай перашкоды для ворага ўжо не прадстаўляла. Паміж сабой ваенныя называлі яе «пастка». У ёй маглі размясціцца некалькі тысяч чалавек, але, каб вывесці іх адначасова, спатрэбілася б шмат часу. Цярэспальскія і Паўночныя вароты выходзілі на мяжу і знаходзіліся ў полі зроку непрыяцеля. Вядома, што яшчэ напярэдадні вайны Іван Лазарэнка звяртаўся да камандуючага 4-й арміяй генерал-маёра Аляксандра Карабкова з прапановай зрабіць два дадатковыя выхады з супрацьлеглага боку крэпасці. Але яны так і не з'явіліся. І чырвонаармейцы падчас вайны апынуліся ў пастцы.

— Каля 4 тысяч салдат выратаваў Іван Сідаравіч, — спасылаецца на архіўныя факты Рыгор Рыгоравіч. — З «Бутыркі» ён пісаў маршалу Сямёну Цімашэнку, што асабіста выводзіў з крэпасці разрозненыя часці 3, 4 і 10 армій. Аб гэтым гаворыцца і ў першых данясеннях камандуючага 28-м стралковым корпусам, генерал-маёра Васіля Папова і Аляксандра Карабкова, якога расстралялі. Такі факт ёсць і ў кнізе Смірнова «Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці». Толькі вось імя ратавальніка там замоўчваецца. А яшчэ Іван Сідаравіч арганізаваў абарону чыгуначнага вакзала, па значнасці не менш важнага аб'екта, чым Брэсцкая крэпасць. Ён паспеў адправіць састаў з раненымі і сем'ямі каманднага складу. Такі факт у Смірнова таксама ёсць, але без удакладнення, хто гэта зрабіў.

### Памілаваны, але не рэабілітаваны

Сын генерала Лазарэнкі так і памёр, не даведаўшыся пра тое, што Івана Сідаравіча не рэабілітавалі. Нават думка аб тым, што здрадніку маглі даць званне Героя Савецкага Саюза, здавалася крамольнай.

— Я сам даведаўся аб гэтым толькі ў 2005 годзе, калі пачытаў кнігі Віктара Суворава «Бяру свае словы назад» і ваеннага юрыста Вячаслава Звягінцава «Вайна на вагах Феміды», — прызнаецца Рыгор Рыгоравіч. — Яны мне падказалі, куды я павінен пісаць і як. Перапіска цягнулася каля 2 гадоў. А ў студзені 2010 года з Масквы прыйшла тэлеграма з запрашэннем на пасяджэнне Вярхоўнага суда.

24 лютага Вярхоўны суд Расійскай Федэрацыі адмяніў рашэнне Ваеннай калегіі Вярхоўнага Суда СССР ад 17 верасня 1941 года і рэабілітаваў Івана Лазарэнку. Было прызнана, што дзеянні камандзіра 42-й стралковай дывізіі «не ўваходзілі ў супярэчнасць з патрабаваннямі кіруючых дакументаў, якія існавалі ў той момант, і адпавядалі абстаноўцы і атрыманым ад штаба корпуса загадам».

Але толькі праз паўтара года пасля суда ўнуку дазволілі азнаёміцца з часткай асабістай справы Івана Лазарэнкі. Грыф сакрэтнасці цалкам пакуль яшчэ з яе не зняты.

— Я вельмі ўдзячны работнікам Міністэрства абароны РФ, якія дапамаглі атрымаць мне дазвол на работу ў архіве Мінабароны Падольска, — кажа Рыгор Рыгоравіч. — Калі я прыехаў туды ў першы раз, мяне выслухалі, але працаваць з дакументамі не далі. Гэтак жа было і з Цэнтральным архівам ФСБ. Толькі пасля ўмяшання міністэрства забарону знялі.

Для Рыгора Рыгоравіча ўстанавіць гістарычную справядлівасць абароны Брэсцкай крэпасці справа не толькі прынцыпу — гонару. Кожны год ён прыязджае сюды, каб паспрабаваць аднавіць хроніку тых падзей. Быў ён тут і на прэм'еры фільма «Брэсцкая крэпасць», які якраз выйшаў на экраны ў той год, калі рэабілітавалі яго дзеда. І тое, што стваральнікі фільма гэтага не ўлічылі, вельмі балюча адгукнулася ў душы. Быццам нехта зноў паставіў на дзеда кляймо.

### Лёд крануўся...

Калі 7 мая 2010 года ў «Известиях» з'явіўся матэрыял Барыса Кліна «Брэсцкай крэпасці вярнулі камандзіра», унук Івана Лазарэнкі, як кажуць, прачнуўся раніцай знакамітым. У яго адрас ішлі пісьмы са словамі падтрымкі, віншаваннямі з Сярэдняй Азіі, Урала. Знайшліся нават сваякі, аб якіх ён не ведаў. Нядаўна яны прыязджалі на адкрыццё памятнага знака на месцы гібелі генерала, які ўсталяваны па ініцыятыве ўнука за прыватныя грошы.

Пляменніца генерала Раіса Чыркова ўспамінала аб тым, якім чулым і справядлівым быў яе дзядзька. Яна прывезла з яго радзімы жменьку зямлі, каб пакласці на магілу.

Помнік вырашана было паставіць каля дарогі, за 800 метраў ад месца апошняга бою. З яго на нас глядзяць уважлівыя вочы чалавека ў ваеннай гімнасцёрцы.



Унук генерала (апошні з правага боку) з роднымі з Санкт-Пецярбурга і Белгародскай вобласці.

На грудзях у яго няма ніякіх узнагарод. Ордэн Айчыннай вайны за ўзяцце горада Жыздр Калужскай вобласці і медаль «За абарону Сталінграда» яшчэ наперадзе. А тыя ўзнагароды, якія ў разжалаванага генерала забралі ў 1941-м, яму так і не вярнулі.

Усё, што засталося ўнуку ў спадчыну ад мужнага дзеда, — гэта брытва, сярэбраны рубель 1924 года, рэмень і гадзіннік «Амега», які Івану Лазарэнку падараваў у Іспаніі камандуючы арміяй «Эбро» палкоўнік Хуана Мадэста. Яго ўразіла, як Іван Сідаравіч асабіста вадзіў кавалерыйскую брыгаду ў атаку. Ён быў жывым прыкладам самаахвярнасці і стойкасці. І гэта, як тую ж узнагароду, нельга адабраць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**

---

■ Рэха трагічнай падзеі



# ІХ ЗАБРАЛА МОРА...

## Чвэрць стагоддзя таму на атамнай падводнай лодцы «Камсамолец» загінулі нашы землякі

**7 красавіка 1989 года ў Нарвежскім моры патанула савецкая атамная падводная лодка К-278 «Камсамолец». З 69 чалавек экіпажа загінулі 42 маракі. Сярод іх і нашы землякі: капітан-лейтэнант, камандзір групы дыстанцыйнага ўпраўлення Сяргей Няжуцін з Ліды, капітан III рангу Анатоль Іспянкоў з Шумілінскага раёна, старшы матрос Яўген Вяршыла з Мядзела і старшы матрос, камандзір аддзялення рулявых-сігнальшчыкаў Ігар Апанасевіч з Клецка. Усе яны ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга пасмяротна.**

### ДОМ ПАД НУМАРАМ 20

З хваляваннем іду па вуліцы Міра. А вось і дом пад нумарам 20. Ігару таксама было 20, калі яго не стала... Дом патанае ў зеляніне, над дахам звісае ўсыпаная сакавітымі ягадамі чарэшня, на градках чырванеюць клубніцы... Стукаю ў дзверы. На мяне дапытліва глядзіць жанчына з дачасна пасівелымі валасамі.

— Вы Алена Антонаўна? Маці Ігара?

— Так, а вы адкуль будзеце? — цікавіцца яна.

У суседнім пакоі на сцяне фотаздымак сына ў рамцы. У жалобнай варце сябры — матросы. Ордэн Чырвонага Сцяга, які перадалі на вечнае захоўванне бацькам, аддае бляскам у сонечных промнях.

Размова спачатку даецца з цяжкасцю.

— Як жыву? — перапытвае яна. — Муж памёр. Але я не адзінокая. У мяне шмат сяброўак, сын, унукі. Ды і ёсць чым заняць сябе: шыю і суседзям, і сабе розныя рэчы — я ж краўчыха па спецыяльнасці, працавала ў мясцовым камбінаце бытавога абслугоўвання. Гаспадаркі не трымаю. Агарод толькі. Два разы на тыдзень прыходзіць сацыяльны работнік, прыносіць з крамы прадукты, дапамагае ў хатніх справах. Малодшы сын жыве недалёка, у Клецку, кіламетры за два ад мяне. Унучка вучыцца ў Баранавічах на тэхнолага, унук заканчвае Жыровіцкі каледж, будзе тэхнікам-электрыкам. Не забываюць, наведваюцца. Унук дапамог адрамантаваць падмурак дома — тынкоўка абсыпалася. У Ігара таксама магла б быць сям'я, дзеці. Але ж... Боль сціхае, калі займаюся справай, хатнімі клопатамі. Але ж усплывае зноў і зноў у кожную вольную хвіліну...

Алена Антонаўна захоўвае спісы з прозвішчамі маракоў, што служылі разам з сынам, іх адрасы, фотаздымкі, песні і вершы, кнігі, прысвечаныя «Камсамольцу». Раней ёй часта тэлефанавалі саслужыўцы Ігара, дасылалі пісьмы. Але ж у кожнага з іх свае паўсядзённыя клопаты, праблемы. Ды і з цягам часу трагічныя падзеі ўспрымаюцца не так востра, як напачатку. Алена Антонаўна трымае сувязь толькі з Уладзіленай Яфімаўнай і Феліксам Эдмундавічам Вяршыла з Мядзела, чый сын загінуў разам з Ігарам.

— Стэлефаноўваемся, навінамі падзелімся, на здароўе паскардзімся. Сёлета нас запрашалі ў Санкт-Пецярбург. У Мікалаева-Багаяўленскім марскім саборы, дзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў гонар загінулых падводнікаў, прайшлі памятныя мерапрыемствы. Але ні я, ні Вяршылы не змаглі паехаць: здароўе не дазваляе, — з жалем канстатуе жанчына.

### ЯГО НАЗЫВАЛІ «БАЦМАНЁНКАМ»

Ігар часта пісаў дадому, дзяліўся радасцямі (камандзір аб'явіў яму ўдзячнасць), планамі на будучыню. Апошні ліст прыйшоў у пачатку сакавіка: «Добры дзень, родныя! Паведамляю вам важную навіну: я надоўга іду ў паход. І лісты пісаць не будзе магчымасці. Так што, не хвалюйцеся. Бліжэйшую вестачку чакайце ў чэрвені. Ігар 24 лютага 1989 года».

А 9 красавіка бацькі атрымалі тэлеграму, што Ігар загінуў пры выкананні службовага абавязку.

— Чаму менавіта ён, мой сыночак? Ён жа быў першы памочнік у доме. Я часта хварэла. Дык ён і ў хаце прыбярэ, і палавікі вытрасе, і паесці прыгатуе. Аднойчы прывезлі торф, а муж на рабоце. Ігар разам з малодшым Алегам яго ўпарадкавалі. А вечарам прысеў каля мяне мой сыночак на лавачцы, а ў яго ўсе рукі ў крывавых мазалях. Сэрца сціснулася ад жалю...

З братам яны вельмі сябравалі. На аднаго пасварышся — другі заступаецца. І ў школе Ігар меў шмат сяброў. Вядома, усякае бывала ў жыцці, але не магу паскардзіцца, што ён мне дастаўляў нейкія непрыемнасці.

Аб прафесіяналізме, смеласці, узаемавыручцы, уменні ахвяраваць сабой дзеля выратавання іншых, сведчаць і саслужыўцы Ігара Апанасевіча, якім пашчасціла застацца ў жывых.

«Добры дзень, паважаныя Алена Антонаўна і Алег Іванавіч! Звяртаецца да вас мічман Віктар Слюсарэнка, адзіны з падводнікаў, хто выжыў ва ўсплываючай выратавальнай камеры падводнай лодкі «Камсамолец». Даўно хацеў вам напісаць, але ўсяляікі раз цяжка было пачаць. Калі ўспамінаю хлопцаў, лодку, на сэрцы такое пачуццё, нібы крываточыць старая, незагойная рана. Паверце, балюча і горка. Але мой абавязак перад імі, каб усе ведалі аб іх подзвігу, каб вы, бацькі марака Паўночнага флоту ганарыліся Ігарам, яго доблесцю, мужнасцю і адвагай.

Ігара называлі «бацманёнкам». Спецыялістам ён быў незаменным, перад самым выхадам у мора здаў на першы клас. У паходзе з Ткачом ён нёс вахту на цэнтральным пасту каля пульта кіравання лодачнымі рулямі. Ваш сын добра адчуваў атамаход, як вопытны вадзіцель машыну. Асабліва добра яму ўдавалася ўтрымліваць лодку на перыскопнай глыбіні. Гэта вялікае майстэрства, асабліва калі наверсе шторм. Ігар хацеў стаць мічманам. У асобе вашага сына ўсе бачылі надзейную змену Ткачу. Дваццацігадовы боцман — гэта рэдкасць на флоце. І што выбар камандавання выпаў на Ігара, ужо гаворыць само за сябе...»

### «ІГАР ПАЙШОЎ САМ, ІНАКШ ПАСТУПІЦЬ НЕ МОГ»

«У той дзень лёс звёў нас у адной аварыйнай партыі. З шостага адсека мічман Калацілін паведаміў, што назірае ўцечку дыму. Праз некалькі секунд у яго ўдарыў вогненны струмень. Шосты пераўтварыўся ў палаючую топку. З пятага ледзь паспелі пракрычаць: «Пажар!» Там успыхнулі пары масла. На людзях загарэлася адзенне. Маракі тушылі адзін аднаго, збівалі агонь з рукавоў, плячэй. Калі падводнікаў удалося вывесці з адсека, скура звісала лахманамі з іх абгарэлых рук.

Узнікла неабходнасць пранікнуць у шосты адсек, калі ён ужо выгараў, каб уключыць сістэму пажаратушэння на сёмым. Аварыйную партыю сфарміравалі з чатырох добраахвотнікаў. У яе ўвайшлі камандзір III рангу Юдзін, Ігар і двое страхуючых. Ігара Апанасевіча ісці ў пекла ніхто не прымушаў. І ніхто б не папракнуў яго за адмову. Але гэта было не ў яго характары. Ігар пайшоў сам — інакш паступіць не мог. Добраахвотнікі прабраліся ў пяты адсек і паспрабавалі адчыніць люк у наступным, але ў іх нічога не выйшла з-за рознага ціску паміж адсекамі. Клапан жа выраўноўвання ціску знаходзіўся ў цяжкадаступным месцы. Адчыніць яго ўзяўся Ігар. З вялікай цяжкасцю ён падпоўз да клапана, яму падалі ключ. І хлопец, лежачы на спіне, пачаў дзейнічаць. Ды нічога не выйшла: клапан заклініла. «Калі Ігар выбраўся адтуль, мы абследавалі перагародку паміж пятым і шостым адсекамі: яна была малінавага колеру. За ёй працягваўся пажар. Вярнуўшыся ў цэнтральны пост, Юдзін аб усім далажыў камандзіру I рангу Ваніну. Праз нейкі час прынялі новае рашэнне — уключыць сістэму пажаратушэння на шосты адсек. Зноў Юдзін і Ігар удвух пайшлі ў пяты адсек і падалі фрэон на шосты. Больш я Ігара не бачыў. Аб яго смерці ведаю толькі ад выжыўшых падводнікаў», — заканчвае свой ліст Слюсарэнка.

У газеце «Падводнік Запаляр'я» ўдалося адшукаць публікацыю за 4 красавіка 1988 года. У ёй карэспандэнт расказаў пра граматныя дзеянні Ігара Апанасевіча падчас вучэнняў. Роўна праз год гэтак жа з веданнем справы, без панікі, наш зямляк дзейнічаў у аварыйнай сітуацыі. І, магчыма, яго прафесіяналізм, памножаны на смеласць і адвагу, выратаваў жыццё астатнім членам экіпажа.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■

---

■ Год гасціннасці: міжнародны кантэкст

# У ЧАКАННІ АДМЕНЫ ВІЗ

## Турыстычнае супрацоўніцтва з Ізраілем: узаемны інтарэс

**Ізраіль — дзяржава, якая ўтварылася толькі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. Да гэтага ў яўрэяў не было сваёй зямлі, яны былі раскіданы па ўсім свеце. Сёння насельніцтва Ізраіля складае каля васьмі мільёнаў чалавек. І прыкладна 1,2 мільёна — выхадцы або нашчадкі выхадцаў з былога Савецкага Саюза. Сярод гэтых людзей шмат і тых, што пераехалі з Беларусі, бо, як памятаем з гісторыі, па тэрыторыі нашай краіны праходзіла мяжа яўрэйскай аседласці. Таму падаецца рацыянальнай ідэя адмены віз з Ізраілем — людзям, для якіх Беларусь — зямля, дзе яны нарадзіліся, гэта неабходна. Ды і беларусам таксама: шмат у каго ёсць сваякі ў Ізраілі. А калі і няма — гэта ўнікальная краіна, дзе знайшлі пачатак тры сусветныя рэлігіі, дзе ўнікальная прырода і старажытная гісторыя... Магчыма, візы адменяць ужо ў канцы гэтага года. Краінам, грамадзяне якіх звязаны ў многім агульнай гісторыяй, трэба пазбаўляцца бар'ераў.**


Сцяна плачу — месца паломніцтва хрысціян і яўрэяў.

Не так даўно давялося пабываць на семінары па турыстычным супрацоўніцтве Беларусі і Ізраіля, арганізаваным Беларускай гандлёва-прамысловай палатай. **Юлія ШЫШКОВА, дырэктар па маркетынгу і продажах турыстычнай кампаніі Ізраіля «Медрафт»**, якая гадоў дзесяць таму пераехала ў Ізраіль з Херсонскай вобласці Украіны, расказала ў сваім дакладзе шмат цікавага.

### ЧАГО МЫ НЕ ВЕДАЛІ ПРА ІЗРАІЛЬ?

1. Сталіца Ізраіля Іерусалім, а не Тэль-Авіў, які з'яўляецца проста буйным горадам, дзе працуе шмат фірм. У нейкім сэнсе яго можна назваць бізнес-сталіцай краіны.

2. Часам ледзь не кожны дзень з навін мы даведваемся пра чарговыя сутыкненні паміж арабамі і ізраільцянамі. Мы ведаем пра сектар Газа і Палесцінскую аўтаномію. Але насамрэч у самім Ізраілі ёсць яшчэ шмат гарадоў, якія кантралююцца Палесцінскай аўтаноміяй. Напрыклад, знакаміты Віфлеем, які знаходзіцца амаль побач з Іерусалімам. Але закрытымі для паломнікаў і турыстаў гэтыя гарады не з'яўляюцца. Праўда, паехаць туды дазваляюць толькі арганізаваным турыстычным групам.

3. Нягледзячы на тое, што добрасуседскія адносіны Ізраіль падтрымлівае толькі з Егіптам і Іарданіяй, гэтая краіна ўсё роўна лічыцца адной з самых бяспечных у свеце.

Калі казаць больш шырока, то Ізраіль — гэта невялікая па плошчы дзяржава. Тым не менш, там можна пабываць ажно ў дзевяці кліматычных зонах, што тлумачыцца ўплывам Міжземнага мора, складаным рэльефам і суседствам з самай вялікай у свеце пустыняй Сахара. Круглы год там цёпла (праўда, летам вельмі горача), таму лепшы час для падарожжаў туды — вясна або восень. Амаль кожны ведае многія ізраільскія гарады з біблейскіх легенд — менавіта там адбываецца значная частка падзей Старога і асабліва Новага Запаветаў. Адпаведна, сюды з'язджаецца вялікая колькасць паломнікаў. Але і нерэлігійных турыстаў тут шмат: многія людзі прыязджаюць у гэтую краіну папраўіць здароўе і проста адпачыць на адным з чатырох мораў: Міжземным, Чырвоным, Мёртвым і біблейскім Галілейскім моры.

**У сярэднім экскурсійны тур у Ізраіль на 7 дзён з улікам білетаў на самалёт, нумароў у атэлі і некалькіх экскурсій будзе каштаваць ад 1000-1200 долараў.**

Пакуль што, нягледзячы на «раскручаныя» турыстычныя і паломніцкія брэнды гэтай краіны, беларусы лятаюць у Ізраіль не вельмі часта. Кансультанты з турыстычных кампаній паведамляюць, што, у асноўным, туры ў гэтую краіну замаўляюць людзі, якія хочуць паправіць сваё здароўе: у Ізраілі вельмі высокі ўзровень медыцыны. Вылецець у Тэль-Авіў можна з Мінска. У сярэднім жа экскурсійны тур на 7 дзён з улікам білетаў на самалёт, нумароў у атэлі і некалькіх экскурсій будзе каштаваць ад 1000-1200 долараў. Паездка для папраўкі здароўя будзе вагацца па цане ў залежнасці ад выбраных працэдур і працягласці лячэння, таму нават прыкладную яе цану мне так ніхто і не назваў.

Расійскія турысты, у адрозненне ад беларусаў, прыязджаюць у Ізраіль нашмат часцей. Юлія ўспамінае, што часам госці, наслухаўшыся пра Сцяну плачу, пытаюць, ці трэба там, у паперцы з просьбай да Бога, пакідаць свой адрас і нумар тэлефона. «На што яны разлічваюць? Што Бог ім патэлефануе? Прыходзіцца тлумачыць усё, як малым дзецям».

**Менавіта з нашай краіны паходзяць два прэзідэнты Ізраіля: Шымон Перэс (нарадзіўся ў колішнім Валожынскім павеце Навагрудскага ваяводства) і Хаім Вейцман (нарадзіўся ў мястэчку Моталь на Піншчыне).**

### РАДЗІМА ШАГАЛА І СУЦІНА

Перспектывы для таго, каб ізраільскія турфірмы звярнулі ўвагу на нашу краіну, ёсць. Падарожжы — значная частка жыцця грамадзян Ізраіля. Каб даведацца, якое месца ў ім займаюць візіты ў замежныя краіны, прасочым, ***як пабудавана жыццё сярэднестатыстычнага ізраільцяніна.***

Трэба сказаць, што яго жыццё значна адрозніваецца ад нашага. Дзеці там вучацца ў школе прыкладна да 18 гадоў. І ў той час як у нас амаль усе пасля атрымання атэстата імкнуцца паступіць у ВНУ, ізраільскія хлопцы і дзяўчаты служаць у арміі. Хлопцы — 3 гады, дзяўчаты — на некалькі месяцаў менш. Падчас службы яны маюць магчымасць знайсці сабе падпрацоўку — барменам, афіцыянткай. Прынамсі, гэта можа быць любы занятак. Потым яўрэйская моладзь зноў-такі не імкнецца ні паступаць у ВНУ, ні ствараць уласную сям'ю — настае час для падарожжаў. Звычайна гэта краіны Лацінскай Амерыкі, Азіі, апошнім часам папулярнасцю карыстаецца Арменія. Супрацоўніца ізраільскай турфірмы Юлія Шышкова не выключае, што неўзабаве цікавай для ізраільскіх падарожнікаў стане і Беларусь — дзякуючы сваёй прыродзе, вельмі адрознай ад ізраільскай, культуры, гісторыі — асабліва таму, што наша краіна цесна звязана з лёсам яўрэйскага народа. Пасля падарожжаў — час зноў папрацаваць, каб зарабіць сабе на вучобу (у Ізраілі не прынята, каб паўналетнія дзеці «віселі на шыі» бацькоў). Нарэшце, у 25-26 гадоў настае час вучыцца. З 30 да 35 гадоў маладыя яўрэі робяць кар'еру і толькі потым ствараюць сям'ю. Суразмоўца запэўніла, што калі хтосьці бярэ шлюб раней, то гэта выклікае вялікае здзіўленне.

Дык вось, Беларусь — гэта радзіма для многіх сённяшніх жыхароў Ізраіля. Нагадаем, менавіта з нашай краіны паходзяць два прэзідэнты Ізраіля: Шымон Перэс (нарадзіўся ў колішнім Валожынскім павеце Навагрудскага ваяводства) і Хаім Вейцман (нарадзіўся ў мястэчку Моталь на Піншчыне). Адпаведна, з адменай віз перспектыўным кірункам многія беларускія турфірмы, асабліва тыя, што базіруюцца ў гарадах, дзе калісьці, а то і цяпер жыло і жыве шмат яўрэяў, бачаць арганізацыю экскурсій у гэтыя месцы — так званы «настальгічны турызм». Другі кірунак — турызм экалагічны. Прырода ў Беларусі сапраўды багатая і вельмі адрозніваецца ад ізраільскай, дзе не так шмат зеляніны, рэк і азёраў. І трэці — культурны турызм. Ёсць нямала таленавітых людзей яўрэйскага паходжання, што нарадзіліся ў Беларусі: Марк Шагал, Хаім Суцін і плеяда мастакоў Парыжскай школы... Сёння іх творы каштуюць мільёны долараў. Дык хіба не цікава даведацца больш пра знакамітых людзей свайго народа, пра зямлю, дзе яны нарадзіліся і выраслі, дзе стварылі свае лепшыя творы?


Будынак былога рэальнага вучылішча ў Пінску, дзе ў свой час вучыўся Хаім Вейцман, першы прэзідэнт Дзяржавы Ізраіль (1949 — 1952 гг.).

### НЕ ТОЛЬКІ ТУРЫЗМ

**Генеральны дырэктар гандлёвага прадпрыемства «Ізраіль-Беларусь» Гедалія КАЎТАНЮК** упэўнены, што эканомікі нашых краін, як гэта ні дзіўна на першы погляд, вельмі падобныя.

— У асноўным эканоміку Ізраіля пабудавалі яўрэі, што пераехалі з Беларусі. У той жа час яўрэйскія купцы шмат зрабілі для беларускай эканомікі. Пэўны дысбаланс у сённяшнім супрацоўніцтве ёсць. І асноўная прычына гэтага ў тым, што ізраільскія бізнесмены не ведаюць пра велізарныя магчымасці для іх у Беларусі.

Такую праблему, лічыць ізраільскі госць, можна вырашыць вельмі проста — даць магчымасць больш часта сустракацца прадстаўнікам беларускіх і ізраільскіх бізнес-колаў.

Што ж, будзем спадзявацца, калі беларускія і ізраільскія турфірмы будуць кантактаваць больш цесна, то прытоку турыстаў у абодва бакі чакаць не прыйдзецца. Тым больш што першыя крокі да гэтага ўжо зроблены, першыя сустрэчы і семінары праведзены.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

■ Вандроўныя нататкі

# «ВЫЙДУ ЗА ЦЯБЕ, КАЛІ ВЫРАСЦІШ ПАРК ДЗІВОСНАЙ ПРЫГАЖОСЦІ»

## Нясумная прагулка па Лошыцы

**Менавіта такую ўмову мазырская шляхцянка Ядзвіга Кіневіч паставіла перад мужчынам, які прасіў яе рукі. І не толькі парк пасадзіць загадала, але і пабудаваць сядзібу, роўнай якой не будзе ва ўсёй Мінскай губерні. Нічога сабе патрабаванні, сапраўды шляхецкія! Аднак зразумець маладую можна: ёй было ўсяго 14 гадоў, а жаніху — 31. Пакуль той парк вырасціць і сядзібу пабудуе, яна якраз пасталее і будзе гатова да вяселля. Так і атрымалася. Яўстах Любанскі выканаў патрабаванні нявесты, зрабіў дабудовы ў сядзібе ў Лошыцкім парку, пасадзіў экзатычныя дрэвы і, нарэшце, гадоў праз шэсць ажаніўся са сваёй абранніцай.**


Востраў кахання.

Аднак фінал у гэтай гісторыі не шчаслівы. Ядзвіга сустрэла на адным з баляў, што ладзіўся ў іх уладаннях, нейкага чалавека (што канкрэтна адбылося паміж імі, гісторыя замоўчвае), а праз два месяцы жанчына скончыла жыццё самагубствам, утапіўшыся ў рацэ (можа, гэта быў і няшчасны выпадак). Будучы ў вялікай роспачы, муж пасадзіў на беразе ракі абрыкосавае дрэва. А акно ў пакоі жонкі загадаў назаўсёды закласці цэглай — ці то ад суму маладога ўдаўца, ці то ад болю разбітага сэрца...

### ПРА ШТО ПОМНІЦЬ ЧЫРВОНАЯ ЦЭГЛА?

Не самы шчаслівы лёс напаткаў і капліцу (алтарню), што ў Лошыцкім парку. Яна была адным з самых старых збудаванняў: яе ўзводзілі яшчэ пры Станіславе Прушынскім, прыблізна ў 1788 годзе. У капліцы вяліся службы. Часам сюды завітваў Станіслаў Манюшка, які любіў іграць на аргане ў суседнім касцёле ў Каралішчавічах. Сутарэнні алтарні выконвалі сваю асаблівую функцыю: у іх хавалі прадстаўнікоў роду Прушынскіх.

Пасля паўстання Каліноўскага, каб знішчыць усякія згадкі пра былыя часы, весці службы ў капліцы забаранілі. У 1905-м іх зноў аднавілі, а ў 1920-м алтарню закрылі канчаткова. У пачатку 1930-х астанкі з сутарэнняў былі вынесены і перазахаваны, а пасля проста разрабаваны. Паколькі многія труны былі свінцовымі, іх адправілі на Лошыцкую машынна-трактарную станцыю і пераплавілі на акумулятары.

Капліца, між іншым, была шасцікутнай. Яе вянчала вежка ў форме шлема. У 1938-м купалы і вежку падарвалі. Падчас Вялікай Айчыннай вайны немцы захоўвалі ў капліцы боепрыпасы і, адступаючы, паўторна ўзарвалі яе.

**Будучы ў вялікай роспачы, муж пасадзіў на беразе ракі абрыкосавае дрэва.**

Да нашага часу дайшлі толькі часткі сцен, якія ўсё-такі змаглі выстаяць. Сёння гэта ўлюбёнае месца для фатаграфавання маладых у вясельных строях. Чырвоная цэгла, магутныя сцены, часам адтуліны ў іх — якраз тое, што трэба для добрага фону. І толькі гісторыя памятае, што калісьці гэтае месца служыла для вечнага супакою сваіх уладальнікаў.

Ёсць меркаванне, што, калі капліца ў Лошыцкім парку будзе адноўлена, тады і людзі зажывуць па-іншаму...

### 100 ГЕКТАРАЎ САПРАЎДНАЙ ПРЫРОДЫ

Суправаджаў нас падчас падарожжа па Лошыцы, паказваў схаваныя дарожкі, звяртаў увагу на самыя лепшыя пейзажы экскурсавод Анатоль Андрушкевіч. Ён, да таго ж, працуе на прадпрыемстве «Мінскзеляньбуд», супрацоўнікі якога шчыруюць у парку. Мы толькі дзівіліся, як такая вялізная плошча можа быць настолькі добра дагледжанай?..

Хочацца адзначыць, што Лошыца — гэта і не парк, і не лес, і не сад, і не месца з даўняй гісторыяй — гэта ўсё разам! Такой прыгажосці даўно не даводзілася бачыць, тым больш у горадзе.

Агульная плошча складае сто гектараў. Агляд тэрыторыі раім пачынаць з гістарычнай часткі, тады ёсць шанц, што на ўсё самае адметнае ў вас хопіць сіл.

Ад аўтобуснага прыпынку «Чэрвеньскі рынак», праз невялікі праход у агароджы (адразу за ім будзе інфармацыйны шчыт, на якім распісаны ўсе цікавінкі Лошыцы), вы трапляеце на старажытную ліпавую алею. Па ёй калісьці ў госці да Любанскіх на сваіх карэтах ездзілі яснавяльможныя пані і паненкі. Кажуць, гэтым ліпам каля 300 гадоў, і яны адны з самых старых у краіне. Зусім хутка ўбачыце домік вартаўніка (недалёка ад капліцы), у якім доўгі час жыў садоўнік Васіль Сямашка. Тут жа і старажытныя пілоны — слупы ўваходнай брамы, з масіўнымі жалезнымі варотамі на іх.


Анатоль АНДРУШКЕВІЧ — найлепшы экскурсавод па Лошыцкім парку.

Прайшоўшы наперад, а пасля павярнуўшы налева, можна трапіць акурат да сядзібы Любанскіх. Цяпер у ёй заканчваецца рэстаўрацыя і плануецца адкрыць музей. Перад фасадам разбіты вялікі газон, які аблюбавалі сабе юныя мастакі для пленэраў і іншыя ахвотныя пацешыць вока і душу маляўнічымі відамі. Побач з сядзібай — аўтэнтычны флігель, які вельмі добра захаваўся. У ім ужо цяпер дзейнічае музей.

Абышоўшы флігель, можна трапіць да ракі Свіслач. Перад вамі паўстане яшчэ адно вельмі рамантычнае месца — востраў кахання. Тут таксама любяць многія фатаграфавацца ў любы сезон. Трапіць на востраў можна па драўляным мосце.

Побач знаходзіцца высокая мураваная альтанка, з замкамі маладых на парэнчах. Пайшоўшы ў адваротны бок, убачыш зграбныя лавачкі і бялюткія пергалы над імі. Дарэчы, пергалы — гэта металічныя канструкцыі, якія ставяцца для таго, каб з часам іх абвілі расліны і над лавачкамі ўтварыўся натуральны шацёр. На супрацьлеглым беразе ракі ўздымаюцца вялізныя старажытныя будынкі бровараў колішніх уладальнікаў Лошыцы, аднак цяпер гэтая тэрыторыя ўжо не адносіцца да парку.

**Усё вакол не толькі зелянее, але і спявае, стракоча — жыве сваім, не парушаным чалавекам, жыццём.**

Калі прагуляцца да канца па гэтай дарожцы ўздоўж ракі, павярнуць налева, пакінуўшы флігель па левую руку, то хутка можна ўбачыць яшчэ адну алею, шчыльна атуленую нізка схіленымі дрэвамі. Яшчэ адно новае загадкавае аблічча гэтага парку!.. Аднак будзьце пільнымі, не прапусціце вельмі ўтульнае месца з правага боку. Гэта невялічкія ўзгорачкі, пакрытыя травой, якія пакажуцца адразу пасля крутых схілаў. За імі, удалечыні, відаць вялізныя дрэвы і гмахі Серабранкі. Тут можна адчуць сябе так, быццам выехаў з горада некуды на прыроду. Усё вакол не толькі зелянее, але і спявае, стракоча — жыве сваім, не парушаным чалавекам, жыццём.

Налюбаваўшыся сапраўднай прыродай, можна прайсці далей па алеі, звярнуць налева і ўбачыць... бяскрайні яблыневы сад! Раней ён меў прамысловае значэнне: яблыкі з яго выкарыстоўвалі на панскіх броварах, чым і тлумачыцца такая вялікая прастора, занятая яблынямі. Аднак у наш час гэтая садавіна даступная кожнаму, хто захоча паласавацца ёй летняй парой.

Далей, за садам, зона для масавых гулянняў, клумбы, сцэна і цэнтральны ўваход у Лошыцу.

### У ЗАМОРСКАЙ ПРЫГАЖУНІ МОЦНЫ АБАРОНЦА!

Пабываўшы ў парку, натуральна, нельга не звярнуць увагу на дрэвы, якія ў ім растуць. Тут шмат тыповых для Беларусі парод: ліпы, дубы, лістоўніцы. Аднак часам можна сустрэць і экзоты: гэта сасна Веймутава, крымская сасна, манчжурскі арэх, манчжурскі абрыкос. Расце і канадскі топаль — дрэва, якое за 15 гадоў можа «нарасціць» такі ствол, які іншыя падобныя прадстаўнікі флоры — толькі за 100 гадоў.

Самая незвычайная расліна ў парку, якая мае, да таго ж, тры ствалы, — гэта магнолія кобус. Радзіма дрэва — далёкая Японія, поўнач Карэі, дзе цёпла і вільготна. Дэндролагі доўга здзіўляліся, як яна можа цвісці ў Беларусі, спрабавалі неяк размножыць, рассадзіць ці прышчапіць, але нічога не атрымлівалася. Ёсць толькі адно тлумачэнне такой жыццяздольнасці ў халодным клімаце гэтага дрэва. З паўночнага боку за ім расце таўшчэзная таполя — яна затуляе сабой магнолію, хавае ад халодных вятроў. Вось такі моцны абаронца ў заморскай прыгажуні!

Цвіце магнолія ў канцы красавіка. Яе кветкі бледна-ружовага колеру, маюць пяць пялёсткаў. Нечым яны нагадваюць лілеі, што растуць у вадзе. Відовішча гэта сапраўды дзіўнае і надзвычай прыгожае.

Ёсць у гэтага месца свае легенды: пра Ядзвігу Кіневіч, якая, не могучы знайсці супакой сваёй душы, блукае па алеях, і пра нейчы цень, што часам з'яўляецца ў тумане над ракой. Але, ці праўда гэта, прыходзьце праверыць самі...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА**

*Чаму вырашылі паехаць?*

**Парк плошчай у 100 гектараў, мае гістарычную частку з сядзібай і флігелем. Яго выбіраюць многія ў якасці прыгожага месца для фатаграфавання.**

*Як дабіраліся і ў колькі абышлося?*

**Ад чыгуначнага вакзала, з прыпынку на вуліцы Кірава, аўтобусам №102 і тралейбусам №6 да прыпынку «Чэрвеньскі рынак». Квіток на грамадскі транспарт у сталіцы цяпер каштуе 3700 рублёў.**


Пленэр перад адрэстаўраванай сядзібай.

■ Дзеля памяці

# АРТ-СУПОЛКА ЗМАГАЕЦЦА ЗА ЛЁС СЯДЗІБЫ

**Вёска Грушаўка Ляхавіцкага раёна вядомая беларусам як радавое котлішча старажытнага рыцарскага беларускага роду Рэйтанаў. Апошнім часам яна ўсё часцей згадваецца ў СМІ. І гэта не выпадковасць, а плён працы групы энтузіястаў, якія стварылі арт-суполку імя Тадэвуша Рэйтана. Яе ўдзельнікі імкнуцца папулярызаваць веды аб прадстаўніках гэтага роду — грамадска-палітычных, вайсковых, культурных дзеячах, а таксама клапоцяцца пра сядзібныя комплексы Рэйтанаў у Грушаўцы (мараць стварыць там культурны цэнтр, прывабны для турыстаў), а таксама апякуюць мемарыяльную спадчыну роду ў розных кутках Беларусі.**

Суботнікі, пленэры, летнікі, фестывалі, супрацьаварыйныя работы, вечарыны і канферэнцыі, артыкулы і мастацкія выставы — гэта няпоўны пералік тых мерапрыемстваў, якія праводзіць арт-суполка. Мінуў год з часу яе заснавання, а ў дадатак да вышэйпералічанага праведзена каласальная навуковая праца ў нашых і замежных архівах. Вынікам гэтага сталі сапраўды сенсацыйныя адкрыцці — напрыклад, абвергнуты 200-гадовы міф, звязаны з датай нараджэння нацыянальнага героя Тадэвуша Рэйтана. Насамрэч ён нарадзіўся ў канцы красавіка — пачатку лістапада 1740 года і названы ў гонар святога Тадэвуша, а зусім не 20 жніўня 1742 года, як у 1820 годзе напісаў старабеларускі гісторык і публіцыст Юльян Нямцэвіч.




Гэта ўсё падводзіць нас да таго, што ў наступным, 2015 годзе, мы маем выдатную нагоду адзначыць на рэспубліканскім узроўні, як і належыць, 275-ю гадавіну з дня нараджэння слаўнага сына зямлі беларускай, Тадэвуша Рэйтана, імя якога з'яўляецца сімвалам шчырага патрыятызму нават па-за межамі Беларусі.

І рыхтавацца да юбілею мы пачынаем ужо ў гэтым годзе. Крок за крокам мы набліжаемся да фестываляў у Пружанах, Грушаўцы, Мінску, а таксама да вялікай мастацкай выставы, прысвечанай гэтаму чалавеку, якая адбудзецца напрыканцы 2014 года ў Нацыянальнай бібліятэцы.

Тадэвушу Рэйтану, 32-гадоваму беларускаму шляхціцу, давялося ўзначаліць невялікую патрыятычную грамаду, якая падчас надзвычайнага Варшаўскага сейма 1773 года адчайна спрабавала не дапусціць падзелаў Рэчы Паспалітай абодвух народаў, не даць адняць ад Вялікага Княства Літоўскага ўсходнія землі сучаснай Беларусі з гарадамі Полацк, Невель, Віцебск, Мсціслаў, Магілёў...

Апрача Тадэвуша, які ва ўзросце 39 гадоў стаў, хутчэй за ўсё, ахвярай змовы сваіх нядобразычліўцаў, іншыя прадстаўнікі роду паспелі шмат чаго добрага зрабіць для нашай зямлі, як і апошнія Рэйтаны, якія будавалі школы для дзятвы, развівалі гаспадарку краіны і бралі на выхаванне шматлікіх сірот, даючы ім «другі шанц».

Дарэчы, у гэты самы час вырашаецца далейшы лёс сядзібы. Ці стане яна казіно-фазэндай сумніўных асоб ці, як таго патрабуюць інтарэсы нашай краіны, будзе жыць культурным жыццём, узвялічваючы подзвіг Тадэвуша Рэйтана, слаўнага сына Бацькаўшчыны, адначасова ствараючы добры імідж нашай Беларусі? Мы выбіраем другое. А вы?..

**Зміцер ЮРКЕВІЧ**

■ Знаходка

## У цэнтры Навагрудка адшукалі... карчму?

**У цэнтры Навагрудка археолагі знайшлі гістарычную забудову. Па словах старшага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі Ірыны Ганецкай, пакуль можна датаваць толькі два апошнія слаі. Верхняя забудова адносіцца, хутчэй за ўсё, да XVII — XVIII стагоддзяў. Гэта можа быць карчма, бо ў гэтым слоі знойдзена шмат элементаў глінянага і шклянога посуду.**

Знаходкі наступнага слою, дзе захаваўся самы вялікі драўляны зруб, характэрныя для жылога дома XVI — XVII стагоддзяў.

Раскопкі праводзіліся на месцы будаўніцтва атэля «Еўропа» ў цэнтральнай частцы горада. Падчас работ археолагам трапіліся элементы гарадской забудовы, пад якой, як высветлілася, знаходзяцца элементы пабудоў яшчэ больш ранняга перыяду. Цяпер спецыялісты лічаць, што там захавалася не менш за чатыры ярусы пабудоў, датаваных розным часам. Дамы былі пабудаваны фактычна адзін над адным. Па папярэдняй інфармацыі, ніжнія слаі могуць адносіцца да XI—XII стагоддзяў.

Пасля завяршэння раскопак элементы гарадской забудовы будуць разабраны і закансерваваны. Іх плануецца перавезці ў адзін з музеяў, каб прадставіць шырокай публіцы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

# Ігуменскі тракт

№ 23 (81)

## ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ: АДРАСЫ АПОШНЯГА ПРЫСТАНІШЧА



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**У айчыннай картаграфіі з'явіўся ўнікальны гістарыяграфічны дакумент. «Белкартаграфія» выпусціла «Карту вайсковых пахаванняў Першай сусветнай вайны».**

Упершыню на карту Рэспублікі Беларусь нанесены агульныя захаванні, індывідуальныя захаванні, брацкія магілы, памятныя мясціны з магчымымі захаваннямі, мясціны былых захаванняў, мясціны перазахаванняў. Пазначана і нацыянальная прыналежнасць могілак (аўстрыйскія, нямецкія, рускія, мусульманскія, інтэрнацыянальныя). Адзначаны стан захаванняў (дагледжаныя, раскапаныя, закінутыя, тыя, пра стан якіх звесткі адсутнічаюць).

Бяры ў рукі карту — і выпраўляйся ў гісторыка-краязнаўчае падарожжа. Нават назвы паселішчаў нанесены не толькі па-руску, але і па-нямецку. На зваротным баку карты — здымкі з невялікімі тлумачальнымі тэкстамі па адрасах захаванняў. Ёсць у выданні і невялікі тэкст агляднага характару пра падзеі Першай сусветнай вайны ў Беларусі. Аўтар — доктар гістарычных навук Анатоль Шаркоў. Навуковымі кансультантамі карты выступаюць Анатоль Шаркоў, Уладзімір Адамушка, Вячаслаў Селяменеў.

— Гісторыя ўвагі да могілак Першай сусветнай вайны на тэрыторыі нашай краіны складаецца з некалькіх этапаў, — расказвае Анатоль Шаркоў. — Магілы ўвогуле маглі б згубіцца, знікнуць у цянётах чалавечай памяці. Усё ж вайна была, як прызвычаіліся яе характарызаваць, «імперыялістычнай», «несправядлівай». Шмат больш значылі ахвяры іншых войнаў: Грамадзянскай, Вялікай Айчыннай... У 1920-я гады пачалася буйная міжнародная кампанія па ўладкаванні і абнаўленні захаванняў Першай сусветнай вайны. Работа працягвалася да 1939 года. На могілках у масавым парадку драўляныя крыжы былі заменены тыповымі надмагіллямі двух відаў — плоскімі плітамі ў форме стылізаванага крыжа альбо вертыкальнымі бетоннымі крыжамі.

— А геаграфія рэалізацыі гэтага праекта — наколькі яна шырокай была? — пытаюся ў Анатоля Васільевіча.

— Мемарыялізацыя, упарадкаванне праводзіліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла тады ў склад Польшчы. На тэрыторыі БССР такія работы не ажыццяўляліся. І ў гэтым адна з прычын, што абсалютная большасць могілак тылавой зоны расійскай арміі беззваротна страчана.

Новы перыяд узнаўлення воінскіх захаванняў Першай сусветнай вайны пачаўся з канца 1980-х гг. Шмат што было зроблена па ініцыятыве мясцовых жыхароў, грамадскіх арганізацый. У многіх рэгіёнах падтрымку аказалі мясцовыя ўлады. У пачатку 1990-х быў створаны Беларускі рэспубліканскі грамадскі арганізацыйны камітэт па ўшанаванні памяці салдат Першай сусветнай вайны. Спрыяе ў гэтай рабоце і Народны саюз Германіі. Дзякуючы агульным намаганням адноўлена і прыведзена ў парадак каля трох з паловай дзясяткаў могілак. Нямала зроблена і 52-м асобным спецыялізаваным пошукавым батальёнам Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. Вядома, што ў Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях, па тэрыторыі якіх праходзіла лінія фронту, захавалася 2458 месцаў пахаванняў Першай сусветнай вайны. З іх: 127 — аўстра-германскіх, 69 — рускіх, 52 — змешаныя. Лічба не канчатковая. Ідуць далейшыя пошукі. І карта, якая толькі што пабачыла свет тыражом 1000 экзэмпляраў, несумненна, падштурхне да такой работы.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

## ГІСТОРЫЯ НА ПАЎМІСКУ

БАЙКІ кухмістра ВЕРАШЧАКІ

Даўняе гэтае слоўца неяк сцерлася, амаль выйшла ў нас з абароту, нічога не кажа сучаснікам. Слоўнікі тлумачаць яго вельмі лаканічна: «Неглыбокая міска». Быццам бы і так, але мне заўжды здавалася, што само слова больш значнае — ёмістае, сімвалічнае. Ёсць у ім няўлоўны прысмак старасвецкага дабрабыту, нетаропкай грунтоўнасці, чагосьці старога і добрага, што цяжка выказаць словамі. У нашай літаратуры паўмісак — посуд часцей урачысты, не для штодзённай ежы. Для таварыскіх бясед, для вяселляў, заручын, юбілеяў.

Вось, напрыклад, традыцыйная валачобная песня:

*Песня спета проці лета,*
*А што, панна, за дар дасі?*
*Сорак яек на* **паўміску***,*
*Каўбасою абкружыўшы,*
*Белым сырам завяршыўшы,*
*Віно ж маё, віно зеляно!*

Ці іншая валачобная, але з гераічнымі ноткамі, успамін пра турэцкую вайну 1877-1878 гадоў:

*А вынес турак* **паўмісак** *злота:*
*І ён на тыя злоты ані ўзгляне,*
*Ані ўзгляне і вачэй не падыме:*
*— Не хачу з туркам пагадзіціся,*
*А хачу з туркам ваяваціся.*

А вось асабісты ўспамін Максіма Танка з нейкага шырокага вяселля:

*Можа, яечня з'едзена ўся,*
*Можа, ў біклагах скупа віна,*
*У латках мачанка вымачана,*
*На* **палумісках** *мала кілбас,*
*Ці караваем абнеслі вас?*

Або кпіна дасціпнага Стопака з панскага лёкая з казкі «Сцізорык», беларускага варыянту «Прыгожай маркізы»: «У цябе нос нізкі, лоб слізкі — от і бачна, што лізаў панскія **паўміскі**».

Або святочнае віншаванне ад Рыгора Барадуліна:

**Паўмісак** *залатой пшаніцы*
*Для юбіляраў дарагіх.*
*На пажаданні не скупіцца —*
*Гадоў жадае столькі ім,*
*Як у* **паўміску** *той пшаніцы,*
*І нават — колькі ў стэпе ўсім.*

Цяперашняе пакаленне, здаецца, гэтага даўняга слова не ведае, не ўжывае. Нават з цяжкасцю ўяўляе, як выглядаў той паўмісак. Дык гэта часцей за ўсё даволі вялікая, адносна неглыбокая талерка, пераважна авальнай формы, на якой падавалі святочныя стравы, выносілі сімвалічныя падарункі шаноўным гасцям. Часам — бляха, брытван для запякання ў печы або духоўцы. Па-руску сказалі б «блюдо», а па-нашаму — «паўмісак» (а «блюдечко» — «сподак», «сподачак», але гэта ўжо іншая гісторыя).


Фаянсавы паўмісак у «турэцкім стылі» з каралеўскай фарфурні Станіслава Аўгуста Панятоўскага, канец XVIII стагоддзя.

У даўняй Рэчы Паспалітай, і потым ужо ў расійскія часы, паўміскі нярэдка аздаблялі прыгожым роспісам, часам на патрыятычныя сюжэты, з эпізодамі паўстання Касцюшкі або напалеонаўскіх войнаў. Так што не такая ўжо і банальная рэч — паўмісак. Да таго ж гэта адзін са сціплых, другарадных, але ўсё ж — сімвалаў нашага мінулага. Занатуйце і калі-нікалі ўжывайце яго пры зручнай нагодзе, каб не абяднела зусім наша мова і сімвалічная прастора, каб не перапынілася пераемнасць з гісторыяй. А майстрам дэкаратыўнага мастацтва варта б не забывацца пра такую форму...

### БАБКА БУЛЬБЯНАЯ З КАЧКАЙ

**Складнікі:** ***2 кг бульбы, 1 шклянка малака, 2 яйкі, 200 г шынкі або іншай вэнджанай свініны, 1 вялікая цыбуля, мяса качкі.***

**Спосаб прыгатавання:** бульбу абабраць і надзерці на дробнай тарцы. Пераліць таркаваную масу ў ільняны мяшэчак (або ў марлю) і адціснуць (не вельмі моцна). У рондалі з тоўстым дном давесці да кіпення малако, дадаць таркаваную масу, стала памешваючы. Варыць каля 1 хвіліны, пакуль уся маса не пабялее. Зняць рондаль з агню і дадаць яйкі, перамешваючы. Шынку нарэзаць кубікамі, цыбулю пакрышыць, падсмажыць на патэльні, дадаць у цеста.

Тым часам запячы ў духоўцы качку. Для бабкі можна ўзяць толькі заднюю частку, крылы, шыйку. Аддзяліць мяса ад костак. Бляху нацерці тлушчам, пасыпаць сухарамі, выліць палову цеста, раскласці мяса качкі, пасыпаць маяранам або мацярдушкай, заліць рэштай цеста. Запякаць у разагрэтай духоўцы каля 1,5 гадзіны. Падаваць на авальным паўміску парэзанай упоперак на тоўстыя кавалкі. Асобна падаць кіслую смятану.

## ОАО «Нафтан» РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ

(с повышением начальной цены)

**бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:**

| Наименование конкурса (пометка на конверте) | Наименование | Инв. № | Год выпуска | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|
| Реализация неликвидов. 14.08.2014 | Полуприцеп МАЗ 9758-012, гос. № 9801ВА | 13150621 | 2002 | 24 600 000 |
| | Полуприцеп МАЗ 9758 012, гос. № А0782А-2 | 13151032 | 2004 | 26 160 000 |
| | Автомобиль МАЗ 54323-032, гос. № АВ5421-2 | 13151245 | 1995 | 48 000 000 |
| | Культиватор к минитрактору КТ-00200 | 15208972 | 2002 | 360 000 |
| | Трактор Т-25, гос. № БЯ 9994 | 04150072 | 1994 | 34 020 000 |

**Состояние удовлетворительное.**
**Предложения принимаются по адресу: 211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 14 августа 2014 года с пометкой на конверте, указанной в таблице.**
**Извещение на проведение конкурса размещено на сайте www.naftan.by.**
**Контактные телефоны: 8(0214) 59-87-83, 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42, (033) 398 08 48, (033) 398 07 67.**

УНП 300042199

## Предложение о покупке акций

УНП 400315195

| | |
|---|---|
| Полное наименование, местонахождение, контактный телефон покупателя акций | Открытое акционерное общество «Приднепровье» Республика Беларусь, 247485, Гомельская обл., г. Речица, ул. Строителей, 2а, тел. (02340) 4-98-48 |
| Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются | Открытое акционерное общество «Приднепровье» Республика Беларусь, 247485, Гомельская обл., г. Речица, ул. Строителей, 2а, тел. (02340) 4-98-48 |
| Цель приобретения акций | На баланс открытого акционерного общества «Приднепровье» по требованию акционеров с целью последующего аннулирования |
| Количество акций, которое намеревается приобрести покупатель | 859 штук акций |
| Цена, по которой покупатель намерен приобрести акции | 35 000 (тридцать пять тысяч) белорусских рублей за одну акцию |
| Срок, форма, порядок и адрес оплаты акций | Денежными средствами в белорусских рублях безналичным перечислением на лицевой счет продавца либо почтовым переводом в течение 10 (десяти) календарных дней после зачисления приобретенных акций на счет «Депо» покупателя |
| Адрес, по которому будет совершаться покупка акций (заключаться договоры купли-продажи) | Открытое акционерное общество «Приднепровье» Республика Беларусь, 247485, Гомельская обл., г. Речица, ул. Строителей, 2а |
| Дата начала срока представления предложений акционеров на продажу акций | 11 июня 2014 г. |
| Дата окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций | 29 июля 2014 г. |
| Дата начала покупки акций (заключения договоров купли-продажи) | 30 июля 2014 г. |
| Дата окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи) | 30 августа 2014 г. |

БАНК ТОРГОВЫЙ КАПИТАЛ
Закрытое акционерное общество

Наименование банка: **ЗАО «ТК Банк»**

**www.tcbank.by**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2014 | 01.07.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 10 242 | 6 891 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 433 | 8 961 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 473 325 | 593 800 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 863 842 | 376 221 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 429 174 | 613 760 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 621 860 | 468 948 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 39 022 | 35 226 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 161 371 | 171 462 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 2 599 269 | 2 275 269 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | 1 789 493 | 1 484 199 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 7 446 | 11 193 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 27 340 | 29 193 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1 824 279 | 1 524 585 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 616 505 | 616 505 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | 168 | 168 |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 106 609 | 105 175 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 21 276 | 6 669 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 30 432 | 22 167 |
| 30 | ВСЕГО капитал | 121 | 774 990 | 750 684 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 2 599 269 | 2 275 269 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2014 | 01.07.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 79 765 | 62 532 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 14 405 | 11 882 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 65 360 | 50 650 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 443 | 993 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 359 | 481 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 84 | 512 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 953 | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 20 995 | (12 712) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 49 376 | 7 956 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 100 663 | 13 958 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 4 977 | 4 739 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 19 036 | 25 344 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 8 | 1 680 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 22 038 | 10 163 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 3 752 | 146 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 18 286 | 10 017 |

**Председатель Правления И.С.Соловьев**

**Главный бухгалтер И.Л.Бурко**

**07 июля 2014 года**

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, № 30 от 19.06.2013, БИК 153001333, УНП 807000163.

## Извещение о проведении аукциона по продаже земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

## Организатор аукциона – ПОДГОРНОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ БАРАНОВИЧСКОГО РАЙОНА

| Местоположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка | Характеристика инженерных коммуникаций | Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории | Площадь земельного участка (га) | Назначение участка | Начальная цена объекта (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский район, Подгорновский с/с, д. Добрый Бор, ул. Сосновая, д. 18. Кадастровый номер 120487002101000169 | Участок свободен от застройки. Водопровода – нет. Газопровода – нет. | Дорога с асфальтовым покрытием. Имеется линия электропередач. Водопровод – не планируется. Газопровод не планируется. | 0,15 | Для строительства и обслуживания жилого дома | 2704650 | 270470 | 5283846 руб. кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ и другие расходы по проведению аукциона |

1. Дата, время и место проведения аукциона: **15 августа 2014 г. в 15.00 в здании Подгорновского сельского исполнительного комитета (актовый зал) по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, аг. Подгорная, ул. Центральная, 128б.**

2. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь.

3. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 10%.

4. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

- заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка (10% от начальной цены);
- копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица;
- доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*5. Сумма задатка перечисляется до 14 августа 2014 г. включительно до 16.00 на расчетный счет 3604211160001, фил. 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 150501245, УНП 200172507, код платежа 04901.*

Адрес банка: Брестская область, г. Барановичи, бульвар Штоккерау, 8а.

Получатель: Подгорновский сельский исполнительный комитет, 225357, Брестская область, Барановичский район, аг. Подгорная, ул. Центральная, 128б.

6. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже земельного участка, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении данного земельного участка. Если два и более участника аукциона согласились с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласился со следующей объявленой им ценой, аукционист предлагает участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона. После объявления участником аукциона своей цены аукционист называет аукционный номер этого участника и предложенную им цену. При этом предложенная участником аукциона цена, равная цене, предложенной другим участником аукциона, не принимается. Участники аукциона объявляют свою цену до тех пор, пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды предложенную им цену и при отсутствии предложений иных участников аукциона объявляет о продаже земельного участка, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему земельному участку. Если после предложения аукциониста участникам аукциона объявить свою цену только один из участников объявит свою цену, аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды предложенную им цену и при отсутствии предложений иных участников аукциона объявляет о продаже земельного участка, а участника аукциона – победителем аукциона по данному земельному участку. Если ни один из участников аукциона не предложил свою цену, аукцион в отношении данного земельного участка признается нерезультативным.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

7. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи:

Каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по тел. (8-0163) 432635; 432636.

8. В случае отказа или уклонения Победителя аукциона в установленный срок от внесения платы за предмет аукциона, выполнения условий, предусмотренных в протоколе аукциона и решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, внесенный им задаток и затраты на организацию и проведение аукциона возврату не подлежат.

9. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

10. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни **с 15 июля 2014 г. в комиссии с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** (Подгорновский сельисполком). Последний день приема документов – 14 августа 2014 г. до 16.30. Заключительная регистрация участников аукциона – **15 августа 2014 г. с 14.30 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

11. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан:

- подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения по объекту , выставляемому на аукцион, доводится до сведения участников до начала проведения аукциона;
